## У Беларусі ўдакладнены катэгорыі грамадзян, якія маюць права на чарнобыльскія льготы

**У Беларусі ўпарадкавана заканадаўства ў сферы сацабароны пацярпелых ад катастрофы на ЧАЭС грамадзян. Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта Беларусі, Аляксандр Лукашэнка 15 лютага падпісаў указ № 68, якім унесены змяненні і дапаўненні ў сем указаў і прызнаюцца страціўшымі сілу шэсць дэкрэтаў кіраўніка дзяржавы. Такія меры прыняты ў мэтах прывядзення дакументаў у адпаведнасць з законам ад 6 студзеня 2009 года «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый» і заканадаўствам, якое змянілася.**

Так, указам удакладнены катэгорыі грамадзян, якія маюць права на чарнобыльскія льготы, з улікам патрабаванняў закона.

Работнікам органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю, ваеннаслужачым і супрацоўнікам органаў унутраных спраў можа прадастаўляцца сацыяльны водпуск у сувязі з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС без захавання грашовага забеспячэння як устаноўлена законам: тым, хто ўдзельнічаў у ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы, — 14 каляндарных дзён у годзе, тым, якія працуюць, праходзяць ваенную службу (службу) на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання — 14 або 7 каляндарных дзён у залежнасці ад зоны забруджвання.

Указам прадугледжваецца назначэнне на пасады ваеннаслужачых з ліку асобаў, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, у воінскія фарміраванні, што не знаходзяцца на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання і не звязаны з работамі па эксплуатацыі крыніц іанізуючага выпрамянення.

Праезд арганізаваных груп дзяцей, якія пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання, у санаторна-курортныя арганізацыі Беларусі, у тым ліку размешчаныя за межамі рэспублікі, і назад будзе ажыццяўляцца на аўтамабільным пасажырскім транспарце агульнага карыстання як рэгулярных, так і нерэгулярных зносінаў. Гэта дасць магчымасць выключыць неабходнасць шматразовых перасадак дзяцей на аўтобусныя маршруты пры дастаўцы іх да месца санаторна-курортнага лячэння.

У сувязі з канцэптуальным змяненнем у краіне падыходу да прадастаўлення водпускаў (скарачэннем іх відаў, працягласці і ўмоў прадастаўлення) указ прадугледжвае ўпарадкаванне прадастаўлення іншых сацыяльных водпускаў ваеннаслужачым, работнікам органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю, супрацоўнікам органаў унутраных спраў.

Названым асобам без захавання грашовага забеспячэння будуць прадастаўляцца таксама водпуск у сувязі з удзелам у баявых дзеяннях на тэрыторыі іншых дзяржаў (як гэта ўстаноўлена законам «Аб ветэранах», Працоўным кодэксам); кароткачасовы водпуск для работы над дысертацыяй і напісання падручнікаў працягласцю да 30 каляндарных дзён замест прадастаўлення для гэтых мэтаў аплатнага творчага водпуску; водпуск па ўважлівых прычынах асабістага і сямейнага характару.

Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

## Індывідуальным прадпрымальнікам у Беларусі дазволена ўносіць абавязковыя страхавыя ўзносы адзін раз у год

**Перыядычнасць выплаты абавязковых страхавых узносаў у Беларусі змянілася. Прэзідэнт Беларусі 13 лютага падпісаў указ № 64, якім унесена змяненне ў Палажэнне аб выплаце абавязковых страхавых узносаў, узносаў на прафесійнае пенсійнае страхаванне і іншых плацяжоў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, зацверджанае ўказам ад 16 студзеня 2009 года № 40.**

Для суб'ектаў малога прадпрымальніцтва з сярэдняй колькасцю работнікаў да 15 чалавек прадугледжваецца штоквартальная выплата абавязковых страхавых узносаў (цяпер штомесячная), а для індывідуальных прадпрымальнікаў — штогадовая (цяпер штоквартальная).

Указам таксама ўстаноўлена, што прыватныя натарыусы, якія з'яўляюцца атрымальнікамі пенсій, а таксама маюць права на дапамогу па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў, маюць права на такі ж парадак выплаты абавязковых страхавых узносаў, якім карыстаюцца прадпрымальнікі з аналагічным статусам.

## Расціслаў Янкоўскі ўдастоены ордэна Айчыны II ступені

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сваім указам узнагародзіў вядучага майстра сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Расціслава Янкоўскага ордэнам Айчыны II ступені.**

Прэзідэнт адзначыў дзяржаўнымі ўзнагародамі 33 грамадзян краіны за ўзорнае выкананне службовых абавязкаў, значныя дасягненні ў навукова-даследчай дзейнасці, заслугі ў педагагічнай і выхаваўчай рабоце, забеспячэнні захавання законнасці, вялікі ўклад у развіццё айчыннага транспарту, культуры, мастацтва.

Генерал-маёр Іван Дырман узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме II ступені», маёр Сяргей Міхайлаў — ордэнам «За службу Радзіме III ступені».

Ордэна Пашаны ўдастоены старшыня суда Аршанскага раёна і горада Оршы Антаніна Карэтнікава, намеснік старшыні Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Алег Пафераў і дырэктар Лужаснянскай школы-інтэрната-гімназіі для здольных і таленавітых дзяцей Віцебскай вобласці Уладзімір Шыцько.

Член Беларускага саюза музычных дзеячаў Іна Зубрыч адзначана ордэнам Францыска Скарыны.

Медалём «За адвагу ў воінскай службе» ўзнагароджаны генерал-маёр Сяргей Патапенка, палкоўнік Павел Мураўейка, падпалкоўнік Міхаіл Аляксееў і старшы лейтэнант Аляксей Чарнуха.

Сярод узнагароджаных медалём «За працоўныя заслугі» і медалём Францыска Скарыны — супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, іншых навучальных устаноў краіны, а таксама прадстаўнікі тэатральных і танцавальных калектываў, работнікі прамысловых прадпрыемстваў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Ва Урадзе

# НА АДРАДЖЭННЕ І РАЗВІЦЦЁ ВЁСКІ НАКІРАВАНЫ BR21 ТРЫЛЬЁН СУБСІДЫЙ І ДАТАЦЫЙ

Ігар ШЧУЧЭНКА

**АГРАПРАМЫСЛОВЫ комплекс за час рэалізацыі дзяржпраграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гады характарызуецца ўстойлівай дынамікай росту сельскагаспадарчай прадукцыі і харчавання, павелічэннем экспарту, зазначыў на ўчарашнім пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі намеснік прэм'ер-міністра Іван Бамбіза. Галоўным чынам, гэта адбываецца за кошт павышэння прадукцыйнасці землеробства і жывёлагадоўлі. «За кошт уласных рэсурсаў сёння забяспечана нацыянальная харчовая бяспека, паляпшаецца структура харчавання», — падкрэсліў намеснік прэм'ера.**

Гаворачы пра вынікі пяці гадоў, на працягу якіх рэалізуецца праграма, Іван Бамбіза, у прыватнасці, канстатаваў павелічэнне аб'ёмаў валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі ва ўсіх катэгорыях гаспадарак на 23,8 працэнта, у тым ліку ў грамадскім сектары больш як на 50 працэнтаў. Запланаваныя паказчыкі па вытворчасці збожжа выканана на 102 працэнты, цукровых буракоў — на 107, агародніны — на 118, насення рапсу — на 200, малака — на 103 працэнты, жывёлы і птушкі ў жывой вазе рэалізавана на 106 працэнтаў. Разам з тым, застаюцца невыкананымі па выніках працы за пяць гадоў заданні па вытворчасці бульбы — 94,4 працэнта і лёну — 75,4 працэнта. Акрамя таго, не дацягвае да сярэднерэспубліканскай аплаты працы зарплата работнікаў сельскай гаспадаркі, якая склала 683 тысячы рублёў, ці ў эквіваленце 244 долары ЗША пры заданні 270—305 долараў. Дарэчы, летась зарплата ў вёсцы павялічылася ў параўнанні з узроўнем адпаведнага перыяду папярэдняга года на 20 працэнтаў пры росце яе ўзроўню па народнай гаспадарцы ў 2009 годзе на 12,6 працэнта.

Закранаючы пытанне пераўзбраення АПК, Іван Бамбіза адзначыў, што гэтая праца ўвесь згаданы перыяд вялася актыўна. Так, было рэканструявана і тэхнічна пераўзброена 1104 малочнатаварныя фермы, 184 комплексы па вырошчванні і адкорме свіней і буйной рагатай жывёлы, 60 птушкафабрык. Добраўпарадкавана ў аграгарадках 718 мехдвароў, 1735 вытворчых тэрыторый, 1142 пад'езды да вытворчых аб'ектаў, сельскагаспадарчым арганізацыям пастаўлена больш як 14 тысяч трактароў, 4 тысячы пагрузчыкаў, больш як 2 тысячы кормаўборачных камбайнаў і шмат іншай тэхнікі. Вёсцы была аказаная таксама значная фінансавая падтрымка: з пачатку рэалізацыі праграмы прамыя і ўскосныя субсідыі і датацыі для АПК склалі больш за 21 трыльён рублёў. Толькі летась на гэтыя мэты з бюджэтаў усіх узроўняў накіравана 4,6 трыльёна рублёў, ці 212 долараў у разліку на 1 гектар, што вышэй за ўзровень 2008 года на 30 працэнтаў.

Аднак, паводле слоў намесніка прэм'ер-міністра, не заўсёды вынікі працы сельгасарганізацый былі адэкватныя дзярждапамозе, таму што не дасягнутая планаваная эфектыўнасць вытворчасці. У прыватнасці, не была забяспечаная стабільная праца па вытворчасці збожжа ў 281 арганізацыі, ці 17 працэнтаў ад усёй колькасці гаспадарак. Ураджайнасць збожжа ў іх пасля дапрацоўкі склала ўсяго 25 цэнтнераў з гектара. «Толькі ў палове арганізацый, — паведаміў ён, — чакаецца станоўчая рэнтабельнасць ад рэалізацыі збожжа. 196 сельскагаспадарчых арганізацый, ці 12 працэнтаў ад агульнай колькасці, удоі малака ад каровы не перавысілі 3,5 тысячы кілаграмаў, трэць гаспадарак не забяспечылі эфектыўную вытворчасць малака».

Іван Бамбіза таксама нагадаў, што па выніках мінулага года сельгасарганізацыі павінны былі забяспечыць узровень рэнтабельнасці сельгасвытворчасці не менш за 22—25 працэнтаў. А рэальна па выніках 2009 года сума чыстага прыбытку склала 1,4 трыльёна рублёў, ці 86 працэнтаў да ўзроўню 2008 года. Узровень рэнтабельнасці па канчатковым фінансавым выніку ў 2009 годзе ў сельгасарганізацыях склаў 14,2 працэнта супраць 18,7 працэнта ў 2008 годзе, у тым ліку ад рэалізацыі прадукцыі 4,2 працэнта супраць 6,3 у 2008-м. Летась рэнтабельнасць была вышэйшая, чым пазалетась, у прыватнасці, па вытворчасці свініны, яек, мяса буйной рагатай жывёлы, бульбе, а ніжэйшай — па вытворчасці збожжа, цукровых буракоў, насення рапсу, малацэ. Паводле слоў Івана Бамбізы, недастатковая рэнтабельнасць не дазваляе забяспечыць расшыранае ўзнаўленне сельгаспрадукцыі без дзяржаўнай падтрымкі, асноўную таварную прадукцыю ў сельскай гаспадарцы дае жывёлагадоўля, гэта гарантаваная крыніца паступлення фінансавых сродкаў на разліковыя рахункі сельгасарганізацый. Адзначыў ён і тое, што ў сельскай вытворчасці недаатрымана каля 1 трыльёна рублёў выручкі з-за больш нізкай гатунковасці малака і перарасходу кармоў. «Гэта сведчыць пра тое, — лічыць намеснік прэм'ера, — што ўзровень гаспадарання па асобных гаспадарках і раёнах мае значныя недахопы і павінен стаць прадметам сур'ёзнага аналізу на ўзроўні аблвыканкамаў, Мінсельгасхарча і райвыканкамаў. Пры значнай падтрымцы дзяржавы ў сельгасарганізацыях такі стан спраў недапушчальны».

Акрэсліваючы планы на гэты год па тэхнічным пераўзбраенні і рэканструкцыі аб'ектаў АПК, Іван Бамбіза паведаміў, што гэтая праца будзе зроблена па 544 вытворчых аб'ектах, у тым ліку 166 малочнатаварных фермах, 14 комплексах па вырошчванні і адкорме свіней, 13 — буйной рагатай жывёлы, 13 мехдварах, 84 зернеачышчальных сушыльных комплексах. Паводле аператыўнай інфармацыі аблвыканкамаў, на гэтыя мэты неабходна 1,5 трыльёна рублёў, у тым ліку каля 1,4 трыльёна крэдытных рэсурсаў. Сёлета таксама прадугледжваецца ператварыць у аграгарадкі 293 населеныя пункты. Патрэбы на гэтыя мэты складаюць 1,2 трыльёна рублёў.

Адзначыўшы, што фінансавы стан АПК, асабліва сельскай гаспадаркі, застаецца складаным, Іван Бамбіза паведаміў, што ў распрацаванай канцэпцыі развіцця сельскіх тэрыторый на наступную пяцігодку, якая будзе разглядацца Урадам, прыярытэт аддаецца захадам, якія забяспечваюць значнае павышэнне эканамічнай эфектыўнасці аграпрамысловага комплексу, што з'яўляецца асновай для яго далейшага дынамічнага развіцця.

# МІНСКІ ТУРНІР К-1 пакажуць на ўвесь свет

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але Віталя Гуркова гэта не бянтэжыць. Пераможца мінскай «васьмёркі» зможа патрапіць у элітную абойму К-1 і пазмагацца з сусветнымі легендамі байцоўскіх адзінаборстваў — Джорджыя Петрасянам, Эндзі Саўэрам, Буакавам Пор Прамукам і іншымі. А значыцца трапіць у гісторыю, замахнуцца на чэмпіёнскі тытул.

Трэба сказаць, што сам Віталь Гуркоў унушае жах многім супернікам.

За што любяць і паважаюць нашага байца? Чаму за яго варта хварэць? Гуркоў — прадстаўнік інтэлектуальнай плыні ў байцоўскіх адзінаборствах, спартоўца, які змагаецца да канца і катэгарычна адмаўляецца прайграваць. Нестандартны, небяспечны. Адзначым, што Віталь — шчыры беларускі патрыёт. Нядаўна баец змяніў пашпарт, каб перапісаць сваё імя і прозвішча на беларускі манер — Vital Hurkou замест рускага Vitali Gurkov.

> **— Лічыцца, што галоўная каронка Віталя — гэта клінч. А ў К-1 дужацца забаронена. У гэтым інтрыга. Ці зможа чэмпіён па тайскім боксе перамагчы па нязручных для сябе правілах? Мы зробім для гэтага ўсё магчымае.**

*— Я ўвесь час падкрэсліваю, што з'яўляюся беларускім байцом і хачу годна прадстаўляць сваю краіну ў вачах замежнікаў, —* распавядае Віталь Гуркоў. *— Хутчэй за ўсё, выходзіць на двубоі я буду пад беларускую музыку — гэта гурт «Троіца» альбо мінская хіп-хоп каманда All Types. Спадзяюся, што музыка дапаможа мне маральна настроіцца на турнір.*

У адборачнай васьмёрцы возьме ўдзел яшчэ адзін прадстаўнік мінскага клуба «Патрыёт» — Замін Гусейнаў, беларускі спартсмен з азербайджанскімі каранямі.

Апроч асноўнага турніру, у Палацы спорту правядуць некалькі так званых супербаёў. З беларускага боку будзе змагацца зорка сусветнага К-1 Забіт Самедаў. Робіцца гэта для таго, каб прыцягнуць яшчэ большую глядацкую аўдыторыю па ўсім свеце.

Чакаецца, што 19 сакавіка ў Палацы спорту збярэцца ўвесь спартовы і творчы бамонд краіны. На турніры чакаюць аматары К-1 рэпера Сярогу, лідара «Ляпісаў» Сяргея Міхалка, футбаліста Аляксандра Глеба, алімпійскага чэмпіёна па цяжкай атлетыцы Андрэя Арамнава і шмат іншых.

**Яўген ВАЛОШЫН.**

### КОЛЬКІ БУДУЦЬ КАШТАВАЦЬ КВІТКІ?

Звычайна праход на турніры такога ўзроўню абыходзіцца ў 50 долараў ЗША, не меней. І нават такія кошты не бянтэжаць фэнаў К-1. Калі ў сталіцы Літвы Вільні ўвосень праходзіў турнір з удзелам нашага Забіта Самедава, галоўная пляцоўка краіны «Сімэнс-Арэна» была забітая да адвалу. Усе ахвотныя так і не змаглі пабачыць турнір на ўласныя вочы.

*— Але ў нас такіх высокіх коштаў не будзе, мы ўсё для гэтага зробім, пастараемся, каб білеты каштавалі, як на звычайны хакейны матч,* — паведамілі «Звяздзе» ў Беларускай федэрацыі тайскага бокса і кікбоксінга. *— Важна каб звычайныя беларусы мелі магчымасць на свае вочы пабачыць у Мінску гістарычны турнір. Ужо хутка білеты паступяць у продаж.*

Уся інфармацыя пра кошты на квіткі і склад байцоў будзе размешчаная на інтэрнэт-старонцы **belarusfight.com.**

Здарэнні

### ТРАПІЎ ПАД ЛЕДЗЯНУЮ ЛАВІНУ

**рабочы КЖУП «Брагінскае», калі выконваў работы па ачыстцы дахаў ад снежнага покрыва.**

48-гадовы мужчына знаходзіўся ў навясным пад'ёмніку аўтамашыны «ЗІЛ-130», калі з казырка дома адвольна абвалілася снежна-ледзяная маса, паведамляюць у прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама. Мужчына памёр у бальніцы, так і не апрытомнеўшы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### Абзац

◢ Пешаходам за адсутнасць святлоадбівальных элементаў у цёмны час сутак з 23 лютага давядзецца заплаціць штраф да Br105 тыс. У гэты дзень уступяць у сілу адпаведныя папраўкі ў КаАП Беларусі. Калі зараз штраф за такое парушэнне складае 0,5 базавай велічыні, то ў далейшым парушальнікам давядзецца раскашэльвацца на суму ад 1 да 3 базавых.

**◢ У Полацкім раёне выратавальнікі ўначы выцягнулі са снежнага заносу ў полі мясцовага жыхара, які замярзаў. Паведамленне аб здарэнні паступіла да выратавальнікаў апоўначы ад жонкі пацярпелага. Яе муж вырашыў скараціць шлях дадому і аказаўся ў бядзе — у полі каля возера Рапнянскае ён трапіў у снежны занос, а жанчына разам з 15-гадовым сынам не змаглі яму дапамагчы. Мужчына 1964 г.н. дастаўлены ў рэанімацыю з пераахаладжэннем і абмаражэннем канечнасцяў.**

◢ Каля 200 чалавек былі эвакуяваны з бальніцы ў Старых Дарогах. Паведамленне ад невядомага паступіла 15 лютага ў 12.47. Ён сказаў, што ў будынку Старадарожскай цэнтральнай раённай бальніцы, якая адначасова з'яўляецца і паліклінікай, у трох месцах закладзены выбуховыя ўстройствы, начыненыя 5 кг тратылу. На месца аператыўна выехалі супрацоўнікі праваахоўных органаў, выратавальнікі і ваенныя. З будынка былі эвакуяваныя каля 200 чалавек — медперсанал і наведвальнікі. Выбуховыя ўстройствы не знойдзены. Старадарожскім міліцыянерам спатрэбілася каля чатырох гадзін, каб затрымаць падазронага. Ім аказаўся мужчына 1964 года нараджэння, рабочы аднаго з прадпрыемстваў. Ён сямейны чалавек, у яго двое дзяцей. Матывы яго паводзінаў пакуль не высветленыя, вядзецца следства, якое ўключае ў сябе і медыцынскі агляд.

**◢ Дырэктара ўнітарнага прадпрыемства, якое знаходзіцца ў Маладзечне, падазраюць у падмане заказчыкаў больш чым на Br172 млн. Прадпрыемства выконвае работы па праектаванні, будаўніцтве будынкаў і збудаванняў, а таксама праводзіць інжынерныя пошукі. Падазроны з ліпеня па снежань 2007 года пад выглядам шпалапрадукцыі, якая адпавядае ДАСТу, паставіў на аб'ект іншага прадпрыемства шпалы, якія не адпавядалі вызначаным патрабаванням па глыбіні прамочвання. Заказчыку была нанесена шкода ў асабліва буйным памеры. Заведзена крымінальная справа, перадае БЕЛТА.**

◢ У Францыі ў панядзелак была абрабаваная дачка мэра Кіева Леаніда Чарнавецкага. Як перадаюць інфармагенцтвы, здабычай рабаўніка сталі ювелірныя вырабы на суму каля 4,5 млн еўра. Жанчына накіроўвалася ў Парыж з аэрапорта імя Шарля дэ Голя, калі злачынец праз акно аўтамабіля выхапіў яе дамскую сумачку. Як мяркуецца, рабаўнік рухаўся на матацыкле, і калі аўтамабіль з дачкой мэра спыніўся на святлафоры ці засеў у заторы, матацыкліст разбіў шкло, забраў сумачку і знік.

### Поўны абзац

**◢ Шведскаму паліцэйскаму пагражаюць дысцыплінарныя спагнанні за забытыя ў пральні матэрыялы крымінальнага расследавання. Супрацоўнік паліцыі, імя якога не называецца, забыўся флэш-накапляльнік у кішэні штаноў, якія прынёс мыць у агульную пральню шматкватэрнага дома. Флэшка вывалілася ў час мыцця і была знойдзена ў пральнай машыне суседам паліцэйскага. Мужчына прагледзеў змест накапляльніка ў сябе дома і знайшоў там дзіцячую парнаграфію. Акрамя таго, там былі звычайныя сямейныя фатаграфіі, на якіх ён пазнаў дзяцей суседа-паліцэйскага. Мужчына звярнуўся ў паліцыю. Як высветлілася, парнаграфічныя здымкі мелі дачыненне да крымінальнай справы, расследаваннем якой займаўся паліцэйскі. Яму не будуць прад'яўляць абвінавачанняў, аднак ён атрымае вымову або штраф.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

По чутках і аўтарытэтна

# ХТО ПАВІНЕН ВЫБІРАЦЬ ПАМІЖ ЭЛЕКТРОННАЙ І ПАПЯРОВАЙ ДЭКЛАРАЦЫЯЙ?

Павел БЕРАСНЕЎ

**«У сястры прыватнае ўнітарнае прадпрыемства, ёй патэлефанавалі з падатковай і заявілі, што да сакавіка ўсе юрыдычныя асобы павінны перайсці на электроннае дэкляраванне. Каштуе гэта 320 тысяч, а такія грошы на дарозе не валяюцца. Падкажыце, калі ласка, гэта сапраўды так ці проста спроба выканаць план?» — на такое пытанне я наткнуўся нядаўна ў інтэрнэце, дзе хлопец прасіў парады ў калектыўнага розуму.**

У прынцыпе, спачатку я не надаў такому пытанню ўвагі, бо электроннае дэкларыванне мае цалкам добраахвотны характар, а ў гэтым канкрэтным выпадку, можа, прадпрымальнік і падатковы інспектар проста няправільна адзін аднаго зразумелі. Аднак літаральна праз дзень я пачуў аналагічную скаргу, праўда, ужо не віртуальную, а досыць рэальную. На прэс-канферэнцыі, якая праводзілася ў Мінскім сталічным саюзе прадпрымальнікаў і працадаўцаў, сваё меркаванне пра электроннае дэклараванне выказала **Таццяна КАЗЛОЎСКАЯ, старшыня грамадскага аб'яднання прадпрымальнікаў Магілёўскай вобласці:**

— Не ўсе добрыя прапановы бізнэс-супольнасці прыносяць станоўчы эфект. У Нацыянальнай платформе бізнэсу-2009 была наша прапанова, каб увесці электроннае дэклараванне і палегчыць такім чынам жыццё, а гэта павярнулася нейкімі праблемамі для прадпрымальнікаў і прадпрыемстваў. Электроннае дэклараванне ўвялі, усё цудоўна, але ў той жа час яно носіць платны характар (трэба купіць праграму), да таго ж, пачалі ўсіх абавязваць на яго падключацца. Выклікаюць нават дробных прадпрымальнікаў, якія займаюцца рамонтам абутку і камп'ютара не бачылі, і прымушаюць падключацца на электроннае дэклараванне, а за гэта трэба заплаціць каля 300 тысяч. Потым трэба падтрымліваць гэтую праграму і плаціць яшчэ грошы. А гэтаму прадпрымальніку трэба проста 4 разы на год аднесці дэкларацыю ў падатковую інспекцыю. Вось і ўзнікаюць праблемы, хоць, здаецца, добрая прапанова была, — падзялілася Таццяна Казлоўская з журналістам праблемамі магілёўскага рэгіёна, дзе, дарэчы, за студзень 2010 года да сістэмы электроннага дэкларавання далучыліся 558 суб'ектаў гаспадарання, у тым ліку і 153 ІП (па звестках з сайта Міністэрства па падатках і зборах).

А вось старшыня Беларускага саюза прадпрымальнікаў Аляксандр Калінін расказаў, што члены яго саюза з прымусовым пераходам на электроннае дэклараванне не сутыкаліся:

— Так, у падатковых інспекцый могуць быць указанні, але нам ніхто не скардзіўся. Такой інфармацыі, што кагосьці недзе прымушаюць, у нас няма. Вядома ж, прапануюць, але прапанаваць — гэта правесці агітацыю, а каб прымушалі — такога няма, — сказаў Аляксандр Фядотавіч. — Пераход на электроннае дэкларыванне павінен быць добраахвотным, але тут для малога бізнэсу нязручны кошт — у некаторых выпадках запоўніць паперкі і адвезці атрымліваецца больш танна, хоць электроннае дэкларыванне — больш перспектыўная форма. Але я, напрыклад, ставіў бы пытанне так: паколькі пераход на электроннае дэкларыванне выгадны для дзяржавы з-за зніжэння выдаткаў на апрацоўку папяровай карэспандэнцыі, то такая працэдура павінна быць бясплатная для падаткаплацельшчыка.

Каб атрымаць інфармацыю, як кажуць, «з першых рук», я патэлефанаваў у Міністэрства па падатках і зборах. **Ала ГЕРМАНОВІЧ, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення інфармацыйных тэхналогій,** расказала, што перавагі электроннага дэкларавання перш за ўсё ў зручнасці і эканоміі часу для плацельшчыкаў, аднак каштаваць гэта будзе для юрыдычных асобаў каля 300 тысяч, а для фізічных асобаў — 113 тысяч. Прычым Ала Іванаўна запэўніла, што гэта цалкам добраахвотна:

— Паслуга цалкам добраахвотная. Калі і ёсць нейкія планы перад падатковымі органамі прыцягнуць пэўную колькасць плацельшчыкаў, то гэта ўсяго толькі планы падатковых органаў, а так гэта добраахвотнае жаданне самога суб'екта гаспадарання.

Пагаварыць на гэтую тэму ўдалося і з **Сяргеем ШКУТОМ, начальнікам аддзела інфармацыйна-тлумачальнай працы Міністэрства па падатках і зборах:**

**— Сяргей Пятровіч, ці ёсць факты прымусу да пераходу на электроннае дэклараванне?**

— Гэтая тэма ўжо аскому нагнала і, шчыра кажучы, надакучыла. Каго і дзе прымушаюць — ніхто не ведае. Для таго каб паменшыць выдаткі плацельшчыкаў пры падачы дэкларацыі, падатковыя органы прапануюць, падкрэсліваю — прапануюць, падключыцца на электроннае дэклараванне, якім карыстаюцца плацельшчыкі ва ўсім свеце. Ніхто пагалоўна не прымушае туды ісці, бо няма на тое падстаў. Вы можаце падаваць дэкларацыю як у электронным варыянце, так і ў папяровым, калі вы лічыце, што такі варыянт для вас найбольш зручны. А электроннае дэклараванне ўводзіцца ў першую чаргу для таго, каб скараціць выдаткі пры падачы дэкларацыі: каб вы меней хадзілі ў падатковы орган і больш часу займаліся сваёй працай. А хочацца марнаваць час, трацішча на бензін і гэтак далей — калі ласка, гэта ваш выбар....

**— А што скажаце наконт кошту новай паслугі?**

— Што датычыцца кошту, то асноўны цяжар яго ляжыць на электронным носьбіце, у якога досыць сур'ёзная ступень абароны. Ні падатковы орган, ні дзяржава на гэтым асаблівых грошай не зарабляюць. Тут аснова — менавіта той ключ і тое праграмнае забеспячэнне.

## Беларусь лічыць неабгрунтаваным прымяненне з 1 ліпеня экспартнай пошліны на нафту, што ўвозіцца з Расіі

**Аб гэтым заявіў журналістам намеснік міністра замежных спраў Беларусі Андрэй Еўдачэнка, перадае БЕЛТА.**

Андрэй Еўдачэнка адзначыў, што для таго, каб Мытны саюз пачаў працаваць на поўную сілу, урадамі даручана экспертам бакоў да 1 ліпеня ліквідаваць перашкоды ва ўзаемным гандлі. Першы раунд перагавораў экспертаў прайшоў ужо ў Маскве, другі раунд запланаваны на пачатак сакавіка. Усе бакі зрабілі свае пералікі прэтэнзій, якія накіравалі ў Сакратарыят Камісіі Мытнага саюза. «З беларускага боку першым пунктам у пераліку прэтэнзій стаіць магчымасць прымянення Расіяй з 1 ліпеня вывазной мытнай пошліны на нафту і нафтапрадукты, якія пастаўляюцца ў Беларусь. Гэта наша фундаментальная прэтэнзія». У названым спісе змяшчаецца і прэтэнзія ў дачыненні да спецэкспарцёраў па газу — манаполіі «Газпрама». «У гэтым спісе стаіць таксама прэтэнзія па доступу на расійскі рынак дзяржзакупак».

### ДЭПУТАТ НЕЗАКОННА РАЗДАВАЎ ЗЯМЛЮ

Пракуратура Докшыцкага раёна завяла крымінальную справу ў дачыненні да грамадзяніна, які, з'яўляючыся дэпутатам і працуючы старшынёй пасялковага Савета, незаконна выдзеліў двум жыхарам раёна зямельныя ўчасткі ля возера. Грамадзяне атрымалі іх (коштам больш за 43,5 мільёна рублёў), а потым афармілі ў прыватную ўласнасць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# «ДАЙЦЕ!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Ігар БУЛАЙ, начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага райвыканкама:**

— Мы патлумачылі Сяргею Харчанку, як правільна паступіць у гэтай сітуацыі, якія ён яшчэ мае правы і льготы. Было сказана, што, заплаціўшы ўзносы на сацыяльнае страхаванне за шэсць месяцаў каляндарнага года, ён атрымае права на штомесячную дзяржаўную дапамогу на дзяцей, старэйшых за тры гады. Калі казаць простымі словамі, сёння, каб нешта папрасіць у дзяржавы, вы павінны дзяржаве і нешта даць. Не выканаў свае абавязацельствы — значыць, страціў права прасіць нейкі від дапамогі ў дзяржавы. Харчанка гэта праігнараваў. І ў 2009 годзе зноў звярнуўся па прызначэнне дзяржаўнай дапамогі на дзяцей, старэйшых за тры гады. Аднак атрымаў адмову ў сувязі з тым, што не заплаціў страхавыя ўзносы за 2008 год. Яму яшчэ раз параілі заплаціць гэтыя ўзносы, але марна...

І што ў выніку? Выканаўшы патрабаванне закона аб абавязковых узносах на сацыяльнае страхаванне (сума за шэсць месяцаў склала б прыкладна 500 тысяч рублёў), сям'я з 1 студзеня 2010 года атрымлівала б дзяржаўную дапамогу на дзяцей, старэйшых за тры гады, у памеры каля 650 тысяч рублёў. Штомесячна. Але, не заплаціўшы страхавыя ўзносы, на гэты від дапамогі ад дзяржавы права не маеш.

Што датычыцца бясплатнага харчавання на дзіця першых двух гадоў жыцця, то ў красавіку 2009 года Харчанка падаў заяву, і сям'я паўгода атрымлівала адпаведны набор прадуктаў (сярэдні кошт — каля 200 тысяч рублёў у месяц). У кастрычніку трэба было зноў звярнуцца па гэту дапамогу і дзіця, якому ў лютым 2010 года спаўняецца два гады, да гэтага часу мела поўнае права на бясплатнае харчаванне. Аднак бацька праігнараваў і гэта.

Дагэтуль, дарэчы, ён не забраў і аднаразовую дапамогу (у памеры пяці базавых велічыняў), якая была выдзелена шматдзетнай сям'і адной грамадскай арганізацыяй. Маўляў, гэта мізэрная сума, а падачкі яму не патрэбныя.

— Гэта адзінкавы выпадак сярод шматдзетных сем'яў у нашым раёне, калі чалавек не ідзе на кантакт і не ўспрымае тое, што яму кажуць па выкананні нормаў заканадаўства, — зазначае Ігар Булай.

У студзені гэтага года ў Харчанкаў нарадзілася сёмае дзіця. Маці, Ганна Антонаўна, атрымае ўсе вызначаныя заканадаўствам выплаты па месцы працы. Акрамя таго, Гродзенскім райвыканкамам з 1 студзеня 2008 года вызначаны аднаразовыя выплаты пры нараджэнні двойні, а таксама чацвёртага і наступных дзяцей. Згодна з гэтым рашэннем, сям'я Харчанкаў у сувязі з нараджэннем сёмага дзіцяці атрымае дапамогу ў памеры 15 базавых велічыняў. Плюс да гэтага, зноў жа, ёсць права на дзяржаўную падтрымку прадуктамі харчавання.

Мяркуйце самі, як усе вышэйзгаданыя факты стасуюцца са сцвярджэннем Сяргея Харчанкі аб адсутнасці дзяржаўных гарантый шматдзетным сем'ям. Але, можа, у гэтым выпадку мае месца нейкая выключная жыццёвая сітуацыя, калі пры ўсім жаданні немагчыма заплаціць тыя страхавыя ўзносы і атрымаць дапамогу на дзяцей? Разам з **Ігарам БУЛАЕМ і дырэктарам Гродзенскага раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Анжэлай ДАЛГАШЭЙ** накіроўваемся ў Азёры.

Першая сустрэча — у мясцовай школе, дзе вучацца чацвёра дзяцей Ганны і Сяргея Харчанкаў. **Намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Іна БІРЭТА** кажа, што ў школе ёсць дзеці з так званых цяжкіх сем'яў, але гэту яна такой назваць не можа. Дзеці акуратна апранутыя, харчуюцца ў школе, як і іншыя, для бацькоў бясплатна, маюць мабільныя тэлефоны. Умовы пражывання, якія Сяргей Харчанка называе «блакаднымі», паводле акта абследавання (верасень 2008 года), ніякай трывогі не выклікалі. Прынамсі ніхто не забараняў гаспадарам адзначыць у акце нейкія праблемы і просьбы па іх вырашэнні, але гэтага зроблена не было. Ніхто не прымушаў Харчанкаў і «паляпшаць» сваё матэрыяльнае становішча: з іх слоў у гэтым дакуменце пазначана, што на той час яны зараблялі паўтара мільёна рублёў у месяц.

Мо, пасля гэтага ўмовы пражывання шматдзетнай сям'і значна пагоршыліся? Едзем паглядзець, што ёсць у сапраўднасці. Усякае даводзілася бачыць работнікам службы сацыяльнай абароны і журналістам, але ў гэтым выпадку ў нас таксама, як і ў настаўнікаў, што складалі вышэйзгаданы акт, не ўзнікла адчування нейкай катастрофы і безвыходнасці, калі дзяцей трэба літаральна ратаваць ад падзення ў бездань. У доме, як і мае быць, прыбрана, цёпла, у адным з пакояў — матэрыялы для далейшага добраўпарадкавання, а ў зале — камп'ютар, які служыць Сяргею Харчанку для яго скаргаў наконт гаротнага стану сям'і і бяздзейнасці дзяржаўных органаў (як потым высветлілася, не толькі ў «Звязду», але і ў іншыя рэспубліканскія інстанцыі).

Заўважаем, праўда, што ў зале не хапае пісьмовага стала для падрыхтоўкі дзяцей-школьнікаў да заняткаў. «Маеце патрэбу ў стале — прывязём», — звяртаецца да гаспадара Анжэла Далгашэй. Але гэта прапанова, як падалося, яго зусім не зацікавіла. Таксама дробязь, «падачка», як і ў выпадку з аднаразовай грашовай дапамогай ад грамадскай арганізацыі?

Не ўбачылі мы і жадання нарэшце прыслухацца да спецыялістаў службы сацыяльнай абароны і выканаць устаноўленыя заканадаўствам умовы для атрымання дзяржаўнай дапамогі на дзяцей ва ўзросце больш за тры гады. Сяргей Харчанка лічыць, што ў дачыненні да яго сям'і трэба... не глядзець на закон, а прымаць асобнае рашэнне на мясцовым узроўні. І ён, такое ўражанне, упэўнены, што «зверху» націснуць на мясцовыя ўлады і тыя ледзь не самі прывязуць яму і грошы, і бясплатнае харчаванне. Мо, яшчэ і прабачэння папросяць?

Пры гэтым Харчанка казырае прозвішчамі кіраўнікоў рэспубліканскага ўзроўню, да якіх звяртаўся са скаргамі, а вось уласных хібаў і блізка не бачыць. «Аргумент» адзін: сям'я шматдзетная, матэрыяльнае становішча складанае і таму дзяржава павінна ўсяляк дапамагаць, не абцяжарваючы яго нейкімі ўзносамі і іншымі ўстаноўленымі законам абавязкамі. Але бюракраты, маўляў, «заганяюць сям'ю ў кабалу».

Дарэчы, а як жа з фермерскай справай? Няўжо і сапраўды, як сцвярджае Сяргей Харчанка ў апраўданне немагчымасці заплаціць узносы на сацыяльнае страхаванне, вынік працы і сапраўды нулявы, зусім без даходу? У гэтым, пэўна, яшчэ трэба будзе разабрацца кампетэнтным органам. А пакуль — толькі некаторыя штрыхі да дзейнасці Харчанкі ў фермерскай гаспадарцы.

Па дакументах, з якімі карэспандэнта «Звязды» азнаёміў **начальнік землеўпарадкавальнай і геадэзічнай службы Гродзенскага раёна Ігар ДОРАШАЎ,** нядоўгая фермерская кар'ера Сяргея Харчанкі (паводле яго слоў, ён ужо адышоў ад гэтай справы і працуе ў прыватнай фірме, хоць фермерская гаспадарка «Белы яр — Агра» па-ранейшаму значыцца ў дзяржаўным рэестры) складвалася так. У верасні 2006 года ён звярнуўся ў Гродзенскі райвыканкам з заявай аб выдзяленні яму зямельнага ўчастка ў пажыццёвае спадчыннае ўладанне для вядзення сялянскай (фермерскай) гаспадаркі на тэрыторыі Парэцкага сельсавета. Яму выдзелілі 20,82 гектара зямлі. А ў апошні дзень 2008 года райвыканкам задаволіў просьбу фермера аб выдзяленні яму яшчэ 67,1 гектара зямлі. Пасля чаго ён, паведаміў Ігар Дорашаў, так і не звярнуўся па пытанні дзяржаўнай рэгістрацыі другога ўчастка. Хоць, што не адмаўляе сам Харчанка, летась займаўся там раслінаводствам з сярэдняй ураджайнасцю збожжавых культур каля трыццаці цэнтнераў з гектара. І пасля разліку за камбайн, сродкі аховы раслін ... «застаўся з нулём». Не выратавалі, маўляў, фінансавае становішча фермерскай гаспадаркі і клубніцы — слаба ўрадзілі.

Аднак ці можна пераканацца ў гэтым на падставе афіцыйнай справаздачнасці? Колькі сабрана збожжа, ягад? Куды прадукцыя рэалізавана? Пакуль аб гэтым не ўдалося даведацца нават **начальніку аддзела статыстыкі Гродзенскага раёна Людміле ПЫРСКАЙ:**

— Раз у год фермерскія гаспадаркі падаюць нам справаздачу аб фінансава-гаспадарчай дзейнасці. Калі чалавек не ведае, як яе скласці, можна прыйсці да нас — заўсёды дапаможам. Так іншыя фермеры і робяць. Аднак для Сяргея Харчанкі патрабаванні заканадаўства аб дзяржаўнай статыстыцы — не ўказ. Ён не зрабіў справаздачу за 2008 год, а таксама па выніках сяўбы і ўборкі ўраджаю летась. Ігнаруе і справаздачнасць аб фінансава-гаспадарчай дзейнасці за мінулы год, якая павінна быць пададзена да 12 лютага. Бланкі яму выслалі, Харчанка іх атрымаў, аднак па сёння (мы гутарылі 15 лютага. — **Б.П.**) не з'явіўся. Накіроўваем яму павестку. Не прыйдзе — напішам у райаддзел міліцыі, каб забяспечылі яго прывод. Калі ж і гэта мера не дасць выніку, то звернемся ў суд. За парушэнне Закона аб дзяржаўнай статыстыцы прадугледжана пакаранне — штраф у памеры ад 50 да 120 базавых велічыняў.

Дык што, і гэтыя патрабаванні Харчанка лічыць бюракратычнымі прыдзіркамі? Можа, асабіста для яго трэба на ўзроўні парламента зацвердзіць нейкі эксклюзіўны кодэкс паводзінаў у грамадстве, дзе толькі правы і зусім няма абавязкаў, з «індульгенцыяй» ад ігнаравання агульнапрынятых нормаў толькі на той падставе, што сям'я шматдзетная?

...У кастрычніку мінулага года Сяргей Харчанка звярнуўся ў райвыканкам з заявай аб адмове ад выдзеленай яму зямлі (пакінуўшы толькі тры гектары), матывуючы гэта адсутнасцю ў фермерскай гаспадаркі абаротных сродкаў, што робіць немагчымым далейшае эфектыўнае вядзенне сельскагаспадарчых работ. Зноў жа варта падкрэсліць, што справаздачнасць аб фінансава-гаспадарчай дзейнасці адсутнічае і таму цяжка меркаваць і пра абаротныя сродкі, і пра іншыя аспекты працы фермерскай гаспадаркі. Можна толькі звярнуць увагу на некаторыя моманты.

У прыватнасці, як стала вядома карэспандэнту «Звязды» з дапамогай **начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Гродзенскага райвыканкама Івана АЛІЗАРОВІЧА,** за здадзенае летась у ААТ «Гроднахлебапрадукт» збожжа ячменю і жыта Харчанку заплачана 22 мільёны рублёў. Гэта толькі тое, што вядома.

— Я ніводнаму фермеру не адмовіў у кансультацыі, парадзе, аднак адпаведнага жадання з боку Харчанкі не заўважыў, — зазначае Іван Алізаровіч. — Раіў яму, напрыклад, дзе больш выгадна прасушыць збожжа кукурузы. Не, адвёз туды, дзе сушка не на газе, а на вадкім паліве, што ўдвая даражэй. А потым скардзіцца, што няма прыбытку, «на нулі».

Як і ўсе фермеры, Харчанка атрымліваў вызначаную заканадаўствам дзяржаўную падтрымку, у прыватнасці, што датычыцца насення, угнаенняў, тэхнікі. Яму выдзелілі трактар МТЗ-21 (тэрмін плацяжу — пяць гадоў, запазычанасць на сёння — 22 мільёны 861 тысяча рублёў), плуг і глебаапрацоўчы пасяўны агрэгат (запазычанасць — 22 мільёны 229 тысяч рублёў), іншую тэхніку, якой, паводле ацэнкі Івана Алізаровіча, дастаткова для апрацоўкі двухсот гектараў зямлі. У Харчанкі не атрымалася. І што, зноў вінаватыя ўсе, толькі не ён сам?

На жаль, у аўтара гэтых радкоў пасля гутаркі з Сяргеем Харчанкам не склалася ўражання, што ён хоча пераасэнсаваць погляды на вышэйзгаданыя пытанні, на свае правы і свае абавязкі. І «перавыхаваць» гэтага чалавека, хоць яшчэ і маладога ўзросту, наўрад ці атрымаецца. А самае крыўднае, бадай, у тым, што погляды бацькі на жыццё ў грамадстве (калі няма адказнасці за ўласныя дзеянні і павагі да законаў, а толькі «Дайце!») могуць стаць нормай і для ягоных дзяцей. Вельмі хацелася б памыліцца ў такім прагнозе.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

*Гродзенскі раён.*

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

17 ЛЮТАГА 2010 г. СЕРАДА № 6 (15610)

Ігар Бузоўскі, першы сакратар ЦК БРСМ:

# «НАШ АКТЫЎ — ПАЎМІЛЬЁНА ЧАЛАВЕК!»



**У Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі цяпер новы лідар. Нагадаем, 27 студзеня на V Пленуме маладзёжнага саюза першым сакратаром Цэнтральнага камітэта БРСМ абраны Ігар Бузоўскі. Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі на сённяшні дзень — самая масавая маладзёжная арганізацыя краіны. Яе асноўныя мэты — стварэнне ўмоў для ўсебаковага развіцця юнакоў і дзяўчат. Актывісты саюза — гэта тыя, хто жадае ўнесці свой важкі ўклад у справу развіцця грамадства і сваёй краіны. Арганізацыя вольнага часу, правядзенне культурна-масавых мерапрыемстваў, выхаванне ў моладзі патрыятызму, любові да роднага краю, прапаганда здаровага ладу жыцця — гэта толькі некаторыя задачы, якія вырашаюць тэрытарыяльныя камітэты Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Усе без выключэння мерапрыемствы саюза накіраваны на самыя розныя катэгорыі маладых людзей: на сельскіх юнакоў і дзяўчат, студэнцтва, працоўную моладзь. Гэта дазваляе не толькі заняць іх вольны час, але і выхоўваць сапраўдных патрыётаў. Як адзначыў першы сакратар ЦК БРСМ Ігар Бузоўскі, у далейшым будуць выкарыстоўвацца новыя формы і метады работы з моладдзю.**

— Калі гаварыць аб перспектывах развіцця маладзёжнага саюза, то ў першую чаргу, яны звязаны з ініцыятывамі маладых. Таму першы крок, які зроблены, гэта было даведзена да сакратароў абласных камітэтаў, каб яны потым па ланцужку да раённых камітэтаў, пярвічных арганізацый данеслі, што неабходна вывучыць, якія ёсць праблемы, цікавыя праекты, ініцыятывы ў моладзі. Галоўнае — адабраць самыя цікавыя ідэі і ініцыятывы і граматна іх рэалізаваць ужо на рэспубліканскім узроўні. Таму, калі гаварыць аб перспектывах, то сёння — гэта пошук самага цікавага, захапляльнага і што ў сваю чаргу будзе карысным маладзёжнаму саюзу. Мы жадаем працаваць з кожным індывідуальна. А гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі ёсць ідэі, якія могуць зараджаць людзей. Наш актыў — гэта паўмільёна чалавек. 500 тысяч — гэта вялікая армія. І зацікавіць кожнага няпроста. Зрабіць гэта можна толькі з дапамогай арыгінальных ідэй і праграм.

***— Па якіх напрамках плануеце працаваць у далейшым?***

— Па-першае, тыя напрамкі, якія ўжо атрымалі падтрымку ў моладзі. Гэта — студатрадаўскі рух. Плануецца аднавіць работу студсавета. Сабраць усіх сакратароў пярвічных арганізацый вышэйных навучальных устаноў, каб даведацца, што адбываецца ў студэнцкіх колах, якія там праводзяцца мерапрыемствы. А мы ў сваю чаргу знойдзем цікавыя, у плане правядзення вольнага часу, дагаворы, паглядзім і каб заробак быў значным. Развіваецца ў нас валанцёрскі рух «Добрае сэрца». Сёння ім мы ахапілі значную колькасць маладых людзей. Не гаворым пра гэта гучна. Пра гэта не трэба гаварыць, а трэба прыносіць карысць людзям, дапамагаць тым, хто мае ў гэтым патрэбу. Гэты рух у далейшым атрымае развіццё. Сёння ў кожным раёне, абласным цэнтры ёсць нашы валанцёры, але зноў-такі плануем усё выбудаваць у адзіную сістэму, каб ахапіць большую колькасць тых людзей, каму патрэбна наша падтрымка і дапамога.

Хочацца прыгадаць яшчэ адзін напрамак. Гэта работа нашых оператрадаў, якія сумесна з Міністэрствам унутраных спраў патрулююць вуліцы. Фактычна юнакі рыхтуюцца да службы ва Узброеных Сілах. Яны наведваюць трэнажорныя залы, цір, лекцыі і мерапрыемствы, якія праводзяцца ў воінскіх часцях. Гэта ўсё фарміруе сапраўднага мужчыну, як бы гэта ні гучала пафасна — патрыёта, калі юнакі прымаюць удзел у гарантаванні парадку падчас масавых мерапрыемстваў сумесна з міліцыяй. А ў далейшым атрымліваюць рэкамендацыі на службу ў элітных падраздзяленнях, таму што яны больш падрыхтаваныя. Фактычна мы фарміруем праз гэты рух моду на здароўе з аднога боку, а з іншага — моду на службу ў арміі.

***— 500 тысяч чалавек — актыў вашай арганізацыі на сённяшні дзень. На вашу думку, гэта многа ці мала?***

— 500 тысяч — гэта трэцяя частка моладзі Беларусі. Для любой арганізацыі -— вялікая колькасць. З іншага боку, гэта каласальная адказнасць. Дайсці да кожнага няпроста. Члены нашай арганізацыі патрабуюць увагі, канкрэтных праектаў, дзеянняў. Разам з тым, гэта, без сумнення, каласальны рэсурс .

***— Як вы можаце ахарактарызаваць актыў вашай арганізацыі?***

— Актыў БРСМ — гэта жывы арганізм, які сваімі думкамі, ідэямі, прапановамі зараджае іншых. Мы вылучаем лідараў у маладзёжным асяроддзі. І зараз гэтая работа будзе выведзена на якасна новы ўзровень. У бліжэйшы час плануецца сумесная работа з Белдзяржуніверсітэтам, Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Беларусі і ЦК БРСМ па арганізацыі сацыялагічнай лабараторыі. Мы паспрабуем яе стварыць на сур'ёзным навуковым узроўні.

Маладыя вучоныя, якія сёння займаюцца сацыялогіяй, псіхалогіяй, распрацоўваюць праграму «Лідар». Сумесна з Міністэрствам адукацыі ва ўсіх навучальных установах, пакуль гаворым толькі пра ВНУ, у далейшым пяройдзем і на школы, прадпрыемствы і іншыя пярвічныя арганізацыі, будзе арганізавана тэсціраванне, так званая, сацыяметрыя. Яна праводзіцца падчас паступлення ў навучальныя ўстановы, але мы жадаем вывесці гэта ў сістэму. Хочам ведаць, хто сёння з'яўляецца нефармальным лідарам у канкрэтным класе, школе, на патоках у вышэйшых навучальных установах, каб гэтых маладых людзей прыцягнуць да актыўнай дзейнасці. Трэба паглядзець: а можа, іх можна прызначыць сакратарамі пярвічных арганізацый. Работа з лідарам дазваляе ўлічыць інтарэсы вялікай колькасці людзей. Напрыклад, калі ў ВНУ 10 тысяч студэнтаў, то, дапусцім, дастаткова 50 чалавек-лідараў, якія могуць зарадзіць сваёй энергетыкай іншых. Таму асноўная задача — пошук лідараў праз новыя формы і метады работы. Думаю, такі падыход будзе падтрыманы моладдзю і стане сур'ёзным рухавіком у развіцці арганізацыі.

***— Як вы заўважаеце: з года ў год аўтарытэт БРСМ у маладзёжным асяроддзі павялічваецца?***

— Пра аўтарытэт можна меркаваць, пачынаючы ад колькасці членаў арганізацыі, заканчваючы проста апытаннем людзей на вуліцах. Методыкі самыя розныя. Сацыялагічныя даследаванні ў далейшым будуць праводзіцца. Пакуль мы можам грунтавацца толькі на колькасным фактары. Вось я зараз пачаў наведваць рэгіёны, глядзець, як там наладжана жыццё моладзі. Магу сказаць, што арганізацыі жывуць і развіваюцца, атрымліваюць водгук у студэнцтва, школьнікаў, працуючай моладзі, у ваеннаслужачых. Ёсць пазітыўны рэзананс, а гэта значыць, што аўтарытэт арганізацыі набірае абароты. Можна зараз гаварыць пра вялікую колькасць мерапрыемстваў, якія ладзяцца штодня ва ўсіх кутках краіны актывістамі БРСМ. У краіне пярвічных арганізацый шмат і іх галоўная мэта — арганізацыя вольнага часу і занятасці моладзі.

***— А як развіваюцца міжнародныя кантакты маладзёжнага саюза?***

— Калі гаварыць пра міжнародныя кантакты, то трэба заўважыць, што маладзёжным саюзам напрацаваны каласальны вопыт. Аднак зноў-такі неабходна падыходы перагледзець. Неабходна, каб кантакты былі выражаны ў канкрэтных справах. І я маю на ўвазе, не толькі абмены, візіты дэлегацый. У нас вельмі добрае ўзаемадзеянне з Венесуэлай. Ёсць канкрэтныя варыянты супрацоўніцтва і развіцця адносінаў, для якіх межы не перашкода. На сёння добрыя кантакты наладжаны з Расіяй, Украінай. Шмат праводзіцца сумесных патрыятычных акцый. Будзем і ў далейшым развіваць маладзёжнае міжнароднае супрацоўніцтва з тым разлікам, каб гэта было цікава нашай моладзі.

**Гутарыла Святлана СУХАРКО.**

### БЛІЦ-АПЫТАННЕ:

**1. *У вольны час — кіно або кніга?* — Кіно.**

**2. *На што кожны дзень не хапае часу?* — На спорт (актыўны адпачынак).**

**3. *Што б вы змаглі зрабіць сваімі рукамі на продаж?* — Карціны. Крыху малюю. Работы з дрэвам (сталярныя, разьба). Але асноўнае — арганізаваць творчых людзей, якія могуць зрабіць нешта сваімі рукамі.**

**4. *З кім з вядомых людзей мінулага жадалі б сустрэцца?* — Генры Фордам, Мікалаем Канстанцінавічам Рэрыхам, Уладзімірам Высоцкім.**

**5. *Любімая пара года?* — Вясна.**

**6. *Калі ўявіць, што на іншых планетах ёсць разумнае жыццё, чаго нам хутчэй чакаць ад сабратаў па розуме: дабра або зла?* — Дабра.**

**7. *Жыццёвы дэвіз?* — Жыць трэба так, каб хацелася пражыць жыццё яшчэ раз.**

## «МАКСІМУМ, або 100 ПРАЦЭНТАЎ»

З 4 па 24 лютага ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» рэалізуецца творча-гульнявы праект «Максімум, або 100 працэнтаў». Гэта своеасаблівы злёт выдатнікаў агульнаадукацыйных устаноў 15-16-гадовага ўзросту. Мэта праекта — развіццё інтэлектуальных і творчых здольнасцяў адораных навучэнцаў.

На працягу змены ў падлеткаў будзе магчымасць стаць членам школьнай Акадэміі навук «Спектр» і прыняць актыўны ўдзел у рабоце дзіцячых даследчых інстытутаў, паўдзельнічаць у інтэлектуальных турнірах і перамагчы ў конкурсе «Акадэмік змены», ажыццявіць экскурсіі ў экацэнтр, на метэастанцыю, біястанцыю і ў Інстытут ядзерных даследаванняў «Сосны». Для школьнікаў будзе арганізаваны «круглы стол» з прадстаўнікамі Міністэрства адукацыі, сустрэча з беларускімі пісьменнікамі і дырэктарам Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалаем Фяськовым. Запланаваны таксама сустрэчы з прадстаўнікамі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, супрацоўнікамі Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі і Парка высокіх тэхналогій. У праграме значыцца і правядзенне адкрытых урокаў членамі клуба «Хрустальны журавель».

Нагадаем, што членамі гэтага клуба з'яўляюцца пераможцы і фіналісты рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## БДУ – у сям'і еўрапейскіх універсітэтаў

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт прыняты ў Еўрапейскую асацыяцыю ўніверсітэтаў (EUA). Гэта найбуйнейшая міжнародная арганізацыя шчыльна супрацоўнічае з міжурадавымі структурамі Еўрапейскага Саюза, а таксама з еўрапейскімі ўстановамі і міжнароднымі асацыяцыямі і аказвае істотны ўплыў на развіццё вышэйшай адукацыі ў еўрапейскім рэгіёне.**

Еўрапейская асацыяцыя ўніверсітэтаў была ўтворана ў 2001 годзе ў выніку зліцця Асацыяцыі еўрапейскіх універсітэтаў і Канфедэрацыі канферэнцыі рэктараў Еўрапейскага Саюза і навукі. Цяпер Асацыяцыя аб'ядноўвае 800 членаў з 46 краін Еўропы. Членства ў Еўрапейскай асацыяцыі ўніверсітэтаў дае права ўдзельнічаць у еўрапейскіх праектах і даследаваннях у галіне развіцця вышэйшай адукацыі і вузаўскай навукі, у канферэнцыях і семінарах, у праграмах павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў ВНУ, а таксама дае магчымасць знаёміцца з апошнімі тэндэнцыямі ў развіцці вышэйшай адукацыі і навукі на еўрапейскім кантыненце.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

белагропромбанк
традиции будущего

**ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»**

С 17 февраля 2010 года на основании Постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 15.02.2010 № 14 размер ставки рефинансирования установлен – 13,0 процентов годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает о снижении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006 и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006 на 0,5 процентных пункта с 17 марта 2010 года.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

Время работы Контакт-Центра Банка:
8.00 - 20.00 - рабочие дни:
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ.
Звонок с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) - по тарифам операторов мобильной связи.

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь

www.belapb.by

## «СІЛА ДВУХ» — ВЯЛІКАЯ СІЛА!



**У мінулыя выхадныя гандлёвы цэнтр «Сталіца» пераўтварыўся ў пляцоўку для брэйк-данса: там прайшоў фінал адкрытага чэмпіянату краіны па брэйк-дансе «Сіла двух-2010».**

**На стылізаваным мастакамі графіці «брэйк-рынгу», які размясціўся пад галоўным купалам супермаркета, спаборнічалі 27 самых моцных беларускіх брэйк-данс дуэтаў. Прычым мерапрыемства было арганізавана на самым высокім мастацкім узроўні, каб гэта сапраўды было цікава гледачам.**

Пачаўся фінальны турнір паказальным шоў у выкананні беларускай зборнай і самых юных танцораў брэйк-данса — Лёхі, Ахмеда, Данілкі. Гэтым танцорам толькі 5-7 гадоў, але яны ўжо на многае здольныя. Згадзіцеся, такое не кожны дзень убачыш. Урачысты парад фіналістаў завяршыўся «ДЖЭМАМ» — маладзёжнай тусоўкай са сваімі правіламі, дзе галоўнымі дзеючымі асобамі былі самі танцоры. Дарэчы, «БРЭЙК-ДАНС-ДЖЭМ» разварушыў не толькі ўдзельнікаў, але і прыхільнікаў вулічных танцаў, прыўнёс у праграму дынаміку і асаблівы каларыт. А затым пачалося само спаборніцтва. У складзе журы былі чэмпіёны з Расіі, Украіны, Беларусі. У прыватнасці, b-boy Tony Rock (двойчы чэмпіён свету, каманда «Top9», Расія, Санкт-Пецярбург); b-boy In_Tact (прадстаўнік самай моцнай украінскай каманды «Ruffneck Attack», Кіеў); b-boy Сокал (прадстаўнік беларускай каманды «Plan DS», самы магутны танцор зборнай Беларусі «Belarusian B Boys», лепшы бі-бой Беларусі 2009 года ); Dj — b-boy Beat Man (каманда «Plan DS», Беларусь). Перад імі стаяла няпростая задача: вылучыць лепшых з лепшых. А гэта заўсёды складана.

Нагадаем, праект «Сіла двух-2010» стартаваў 16 студзеня ў Брэсце абласным адборачным турам. Затым яны прайшлі ў Гродне, Віцебску, Магілёве, Мінску, Гомелі, Слуцку. Па ўмовах харэаграфічных спаборніцтваў арганізатары прапанавалі ўсім жадаючым бі-боям (b-boys) і дзяўчатам, якія танцуюць брэйк-данс (b-gerls) заявіць пра свае творчыя магчымасці і здольнасці на ўсю краіну. У выніку ў фінал трапілі 27 брэйк-данс дуэтаў, а пераможцам адкрытага чэмпіянату Беларусі па брэйк-дансе «Сіла двух-2010» стаў дуэт з Мінска «Майцізулу».

Раскажам пра склад каманды-пераможцы. Першы брэйкдансіст — СВІФТ (Дзмітрый Зінкевіч), член брэйк-данс каманды «Hunters», зборнай Беларусі па брэйк-дансе «BELARUSIAN B BOYS». Як кажуць знаўцы, тое, што робіць Свіфт падчас battle, можна параўнаць толькі хіба што з вобліскам святла, або выбухам бомбы. Хоць у жыцці ён самы добры чалавек. Другі танцор-пераможца — ФАНТАМАС (Яўген Чарняўскі) — член брэйк-данс каманды «Plan DS», зборнай Беларусі па брэйк-дансе «BELARUSIAN B BOYS». Уладальнік унікальнага музычнага слыху. Самы малады танцор каманды. Заслужыў месца ў зборнай Беларусі сваім майстэрствам і упартасцю. Зараз маладыя людзі могуць, як кажуць, спачываць на лаўрах, бо яны прызнаны лепшымі ў гэтым годзе. Хто зойме месца пераможцы ў наступным, пакажа час. Так, што астатнім брэйк-данс дуэтам застаецца толькі рыхтавацца.

Як адзначылі ў ЦК БРСМ, «Сіла двух» — гэта не проста танцавальныя спаборніцтвы ў дуэце. Гэта мабільнасць, камунікабельнасць, работа ў камандзе, «пачуццё локця», доказ, што двое — гэта вялікая сіла!

**Святлана СУХАРКО.**

# САКРЭТЫ РОТЫ ГАНАРОВАЙ ВАРТЫ

**МЕНАВІТА яны сустракалі Берлусконі і Чавеса, Мядзведзева і Назарбаева, дэлегацыі Еўрасаюза і шмат каго яшчэ. Яны — гэта салдаты роты Ганаровай варты Беларусі, якая сёлета святкуе сваё пятнаццацігоддзе.**

### ЕЎРАРАМОНТ І АКУСТЫЧНАЯ СІСТЭМА

Казармы роты ганаровай варты ваеннай камендатуры Узброеных Сілаў месцяцца на ўскрайку Мінска. Дваццаць хвілін на аўтобусе па заснежаных гурбах да Уручча, і вось яны, вароты часці.

Звычайны ўтаптаны снег на пляцы, звычайныя салдаты ў зялёным камуфляжы. Знешне вайсковая часць роты ганаровай варты нічым не адрозніваецца ад шараговай.



— Як і любое іншае, наша падраздзяленне пачынаецца з тумбачкі днявальнага. У нас таксама ёсць і нарады, якія складаюцца з дзяжурнага па роце і чатырох днявальных, — расказвае прыстаўлены да журналістаў экскурсавод Фёдар Астаповіч. Высокі малады хлопец у зялёным вайсковым кіцелі, у белых пальчатках і начышчаных да бляску ботах выклікае міжвольнае любаванне.

**Рота ганаровай варты:**
**Дзень нараджэння: 17 лютага 1995 года**
**Першы камандзір: старшы лейтэнант Канстанцін Чарнецкі**
**Склад: 112 салдатаў тэрміновай службы**
**За 15 гадоў «школу» ганаровай варты прайшлі 1200 вайскоўцаў.**

Распарадак дня, побытавы ўклад у роце ганаровай варты нічым не адрозніваецца ад звычайнага армейскага. Пастраенні, нарады, сняданкі і абеды — усё ўпісана ў строгі рэжым дня, якому кожны вайсковец павінен падпарадкавацца.

«Спальня», калі можна так назваць месца, дзе спяць салдаты, — гэта вялікае памяшканне бэжавага колеру. І, здаецца, з еўрарамонтам. Тут няма тых двухпавярховых ложкаў, якімі адрозніваюцца іншыя казармы. Яны заменены на аднапавярховыя драўляныя. Замест звычайных драўляных табурэтак — мяккія сучасныя крэслы. Пасярэдзіне спальні зверху ўманціраваны два тэлевізары і падведзена акустычная сістэма.

### БОТЫ ПАВІННЫ БЛІШЧАЦЬ КРУГЛЫЯ СУТКІ

Ёсць у часці і асаблівае месца — пакой, дзе захоўваецца парадная форма. Нечым нагадвае гардэробную «зорак»: люстраныя дзверцы шафаў-купэ хаваюць за сабой строгія шэрагі зялёных і сініх шынялёў ды кіцеляў. У асобных каробачках захоўваюцца каракулевыя шапкі.

Летам салдаты ганаровай варты апранаюцца ў шарсцяныя кіцелі, штаны, запраўленыя ў боты, ды фуражкі на галаву. А зімой фуражка замяняецца на каракулевую шапку, кіцель — на шынель. Пастаяннымі і зімой, і летам застаюцца начышчаныя да бляску хромавыя боты. Форму шыюць па спецыяльным заказе, аднак звальняюцца салдаты не ў ёй, а ў звычайнай армейскай. Што, вядома ж, крыху сумна.

На пытанне журналістаў, ці не горача летам у такой вайсковай форме, салдаты адказваюць адмоўна. Дарэчы, па словах вайскоўцаў, ботаў хапае на 1—1,5 года, а жалезныя набойкі на іх даводзіцца мяняць кожны месяц.

Узоры формы адзення сімвалізуюць разнастайныя роды войскаў. Форма аліўкавага колеру абазначае сухапутныя войскі, а блакітная — ваенна-паветраныя войскі і войскі супрацьпаветранай абароны.

— Форма адзення, асабліва парадная, павінна быць у ідэальным стане. На выездах недапушчальна ніякіх складак, незашпіленых гузікаў. Усё павінна быць ідэальным, асабліва твар. Калі ў каго на скуры раздражненне, карыстаемся танальнымі крэмамі, — тлумачыць Фёдар. — У часці на кожнае пастраенне (а іх бывае да шасці ў дзень) ты таксама павінен выглядаць ідэальна. Так што боты павінны блішчаць круглыя суткі.

У «гардэробнай» стаяць чырвоныя штандарты першага, другога і іншых беларускіх франтоў, якія звычайна выкарыстоўваюцца ў парадах на Дзень Перамогі.

За кратамі ў спецыяльным пакоі захоўваецца зброя часці. Шэрагі самазарадных карабінаў Сіманава пабліскваюць металічнымі стваламі. Вага аднаго незараджанага карабіна 3,75 кг. Менавіта з імі выконваюцца ўсе страявыя прыёмы.

— Парадныя карабіны выкарыстоўваюцца толькі на выездах. У працоўных жа прыклады мяняюцца вельмі часта. На кожнай чыстцы зброі (раз на два тыдні) мяняецца каля 30—40 прыкладаў, — расказвае Фёдар Астаповіч.

Па словах салдата, бываюць моманты, калі карабіны разлятаюцца ўшчэнт на звычайных трэніроўках.

Да зброі тут ставяцца вельмі паважліва. Парадныя карабіны старaслужачыя ўрачыста перадаюць новаму пакаленню.

### КАНЦЭРТЫ НА ПЛЯЦЫ

Пастраенні, якія мы бачым на парадах, называюцца «пляц-канцэрты». Гэта сапраўдны канцэрт з музыкай, сваёй драматургіяй і сваімі правіламі.

Калі салдаты роты паказвалі невялічкі пляц-канцэрт спецыяльна для журналістаў, нават тут уразіла іх зладжанасць. Яны выконвалі практыкаванні пад лік аднаго з салдатаў.

— Вядома ж, на самім парадзе яны так услых не лічаць, — расказвае камандзір роты Дзмітрый Карповіч. — Тут яны прызвычайваюцца, і ўжо на парадзе за кошт гэтай звычкі дасягаецца сінхроннасць. Самае складанае не ў развучванні элементаў, а ў адначасовым іх выкананні ўсімі разам. Вось у гэтым уся прыгажосць.

**Патрапіць на службу ў роту можа зусім не кожны. Рост салдата павінен быць ад 182 да 194 сантыметраў. Акрамя таго, кандыдат павінен мець правільныя рысы твару.**

Новыя элементы прыдумваюць самі салдаты разам са сваімі камандзірамі.

— Часта на перапынку стаіш з хлопцамі, карабін у руках круціш-круціш, і раптам з'яўляецца нешта новае, — расказваюць юнакі.

— Шмат прыёмаў маюць назву, атрыманую ад прозвішчаў салдатаў, — апавядае Дзмітрый Карповіч. — Ёсць такі прыём «шміт». У ім перакідваюць карабін. Вельмі папулярны: прымянялі на двух плац-канцэртах. А яго разам з камандзірам прыдумаў два гады таму сяржант Шміт. Вось і прыжылося імя.

Музыку для выступленняў падбірае начальнік аркестровай службы Узброеных Сілаў. Пасля чарнавы варыянт дэманструецца міністру абароны, які ўспрымае плац-канцэрт як глядач. І, калі патрэбна, уносіць карэкціроўкі. Па словах ваеннага каменданта Узброеных Сілаў палкоўніка Анатоля Грыцава, звычайна міністр уносіць карэктывы толькі ў працягласць выступлення.

— Улічваюцца нават пажаданні ўдзельнікаў параду, — адзначае Анатоль Грыцаў. — Бывае так, што марш гучыць добра, але вось маршыраваць пад яго складана. На мой погляд, самы лепшы марш — «Дзень Перамогі». Пад яго лепш за ўсё ісці. Ну і таксама «Развітанне славянкі».

Дарэчы, каманды на ўрачыстых цырымоніях аддаюцца па-беларуску, аднак трэніроўкі ідуць па-руску.

Дзень абаронцаў Айчыны рота будзе святкаваць... узмоцненай працай.

— Мы дастаткова шчыльна задзейнічаны ў дзяржаўных мерапрыемствах, — кажа Анатоль Грыцаў. — 22-га частка роты ганаровай варты і аркестр будуць скіраваныя ў Гродна. Казаць пра тое, што асабоваму складу можна будзе адпачыць, не прыходзіцца.

Аразу ж пасля 23 лютага рота прыступіць да рэпетыцый плац-канцэрта для параду ў Дзень Перамогі.

### «КАЛІ Я ЎПЕРШЫНЮ ЎБАЧЫЎ УГА ЧАВЕСА, ХАЦЕЎ ЗА ІМ УСЛЕД ПАЙСЦІ»

Гледзячы на маладых высокіх шыракаплечых хлопцаў, якія стаяць у каравуле на плошчы Перамогі ці ўскладаюць вянкі каля помніка, або брава маршыруюць у парадных разліках, складваецца ўражанне, што ўсё гэта робіцца проста і лёгка. Аднак і ў салдатаў ганаровай варты таксама ёсць свае цяжкасці.

— Спачатку складана было захоўваць каменны выраз твару, — дзеліцца ўражаннямі Фёдар Астаповіч. — Калі мы сустракалі Уга Чавеса (я ўпершыню бачыў гэтага чалавека блізка), хацелася за ім проста ісці і глядзець. Бывае, нехта нават рот прыадкрые ад здзіўлення...

— Мы глядзелі, як сустракаюць іншых кіраўнікоў у іншых краінах, — расказваюць салдаты. — Адрозненняў шмат у дробязях. Напрыклад, ва ўкраінскай роце ганаровай варты рухі больш плаўныя на пастраеннях. Рота ганаровай варты ЗША карабін носіць у левай руцэ. Калі чалавек не звязаны з гэтым, то адразу і не заўважыць такіх нюансаў. А тут глядзіш і адразу заўважаеш: нешта не тое.

### «МАМА СКАЗАЛА: «СХАДЗІ, ГЭТА ТАБЕ БУДЗЕ ПАТРЭБНА»

Фёдар Астаповіч родам з вёскі Бабоўка Жлобінскага раёна. Хлопец скончыў чыгуначны каледж, адпрацаваў год і пасля прызваўся. У роту прыйшоў 10 жніўня мінулага года.

— Калі мне прапаноўвалі служыць тут, я спачатку збянтэжыўся, думаў заўжды, што тут няма салдатаў тэрміновай службы, — расказвае Фёдар.

Першы яго выезд адбыўся меней чым праз месяц. На пахаванні лётчыкаў з Баранавічаў, якія загінулі мінулым летам у Польшчы, Фёдар нёс труну.

Час, калі курсанту можна ўжо браць удзел у мерапрыемствах, залежыць ад яго падрыхтоўкі. Гэта можа быць некалькі тыдняў. Маладое пакаленне салдатаў роты пакуль развучвае толькі страявыя крокі і не дапускаецца да ўдзелу ў мерапрыемствах.

— Гэта вельмі цяжкая праца, затое пасля прыгожа атрымоўваецца. Хочацца навучыцца, — расказвае навабранец Аляксей Галянкоў. — Я вучыўся ў Гомельскім дзяржаўным машынабудаўнічым каледжы, а пасля паступаў ва ўніверсітэт імя Францыска Скарыны. Калі мне прапанавалі тут служыць, спачатку пацісnуў плячыма, таму што не зразумеў, што гэта. Але пасля прагледзеў інтэрнэт і пагадзіўся. Мама спачатку была супраць, а пасля сказала: «Схадзі, гэта табе патрэбна». Гонар быў у таты. Ён нават у лісце напісаў, што нібы ў маладосць акунуўся.

Салдаты ацэньваюць сваю службу ў роце ганаровай варты як прэстыжную.

— Пасля яе можна з лёгкасцю паступаць у Ваенную акадэмію і кар'еру зрабіць у войску, — кажа Павел Вашчыла.

**Настасся ЗАНЬКО.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**



# СЁННЯ ДЗЕНЬ СПАНТАННАГА ПРАЯЎЛЕННЯ ДАБРЫНІ — МІФ ці РЭАЛЬНАСЦЬ

**Паводле народнай мудрасці, дабрыня — гэта тое, што могуць пачуць глухія і ўбачыць сляпыя. 17 лютага жыхары многіх краін адзначаюць Дзень спантаннага праяўлення дабрыні. З гэтай нагоды я і спытала ў выпадковых мінакоў пра тое, наколькі патрэбны такі дзень.**

**Ксенія ФІЛІПЕНКА, выкладчык фізічнай культуры:**

*— На маю думку, абавязкова такі дзень патрэбны сучаснаму грамадству, бо ў нашым жыцці столькі расчараванняў, няшчасцяў. У некаторых нават няма блізкага чалавека, які мог бы падарыць сваю дабрыню. Побач з кожным павінен быць той, хто можа падзяліцца любоўю і пяшчотай. Лічу, што, хутчэй за ўсё, тыя, у дачыненні да каго была своечасова праяўлена дабрыня, адкажуць тым жа.*

**Таццяна ГАЎДЗІС, студэнтка лінгвістычнага ўніверсітэта:**

*— Лічу, што Дзень спантаннага праяўлення дабрыні абавязкова неабходны ў нашым жыцці, каб праявіць увагу да зусім незнаёмых людзей.*

**Наталля КАМІСАРАВА, псіхолаг:**

*— Дня спантаннага праяўлення дабрыні не павінна быць. Для такога важнага пачуцця не хопіць усяго толькі аднаго дня, бо яно праяўляецца праз словы і дзеянні, а сеяць дабро варта заўсёды, нягледзячы на натхненне ці праблемы, ад якіх мы нікуды не схаваемся. Штодзень праяўляць такое важнае пачуццё здольны толькі вельмі моцныя асобы.*

**Яўген ПАНЦЭВІЧ, вартаўнік:**

*— Я думаю, што дабрыню варта праяўляць не толькі 17 лютага, але і заўсёды. Чаму, калі існуе дзень барацьбы са смаленнем, мы не можам вылучаць Дзень спантаннага праяўлення дабрыні. Раю менавіта сёння проста спакойна падзякаваць у краме, лішні раз усміхнуцца, праявіць увагу тым, хто гэтага ад вас зусім не чакае.*

**Святлана ХРАМЧАНКА, цырульнік салона прыгажосці:**

*— Думаю, усё ж такі патрэбны Дзень спантаннага праяўлення дабрыні. Калі ёсць дзень, напрыклад, калі мы просім адно ў аднаго прабачэння, чаму ж не можам праявіць свае самыя лепшыя пачуцці. Лічу, што кожны ў поўнай меры можа праявіць дабрыню ў межах сваёй прафесіі. У такі дзень не сорамна і абняць каго-небудзь, галоўнае, каб цябе правільна зразумелі, прынялі за адэкватнага чалавека.*

**Андрэй ПАПОЎ, юрысконсульт:**

*— Безумоўна, такое свята неабходна, каб нагадваць іншым людзям, што ёсць яшчэ на свеце дабрыня. Вельмі часта ў паўсядзённым жыцці мы забываем, што вакол нас ёсць людзі, якім яна жыццёва неабходная. Вядома, існуе дзень абдымкаў, чаму ж тады не быць дабрыні. 17 лютага прапаную задумацца над сваімі ўчынкамі, прабачыць усё дрэннае, што было зроблена, але не трэба рабіць з гэтага культу. Дабрыня — не запраграмаваны працэс, а спантанны, заўсёды своечасовы і тэрміновы.*

**Аляксей ПАПЛЁЎКА, электраманцёр:**

*— У дом, дзе заўсёды ўсміхаюцца, абавязкова прыйдзе шчасце. На маю думку, кожны дзень трэба здзяйсняць добрыя ўчынкі, за якія не будзе сорамна, а не толькі адзін раз у год. Сваю сям'ю неабходна атульваць дабрынёй — і толькі тады прыйдзе адчуванне сапраўднага шчасця. Дзень спантаннага праяўлення дабрыні — магчымасць сцвердзіць сябе як асобу, паказаць любоў да блізкіх.*

Менавіта 17 лютага ўсе стараюцца быць добразычлівымі і ўважлівымі. Нягледзячы нават на тое, што мы адчуваем або з якім настроем прачнуліся. Праяўляць дабрыню — значыць жыць з адкрытым сэрцам. Паводле меркаванняў жыхароў сталіцы, дабрыню трэба паказваць не толькі сёння, але і кожны дзень. Відавочна, застаецца толькі пазайздросціць тым, чыя прафесія вымагае быць заўсёды ў добрым настроі, што не залежыць ад даты календара ці надвор'я.

Дзень спантаннага праяўлення дабрыні мае пэўную дату, але гэта зусім не сведчыць пра тое, што толькі сёння мы з вамі можам зрабіць што-небудзь прыемнае, незвычайнае, проста так, без прычыны. Некаторыя сцвярджаюць, што калі мы шчаслівыя, то заўсёды добрыя, але калі ж мы добрыя — далёка не заўсёды шчаслівыя. У штодзённым мітуслівым жыцці ўсё магчыма: міф можа стаць рэальнасцю.

**Наталля ГАЛІЕЎСКАЯ.**

**У БЕЛАРУСКІХ ШКОЛАХ НА ЎРОКАХ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БУДУЦЬ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЦА ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ**

# КАМП'ЮТАР... НА СЛУЖБЕ ЗДАРОЎЯ

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Як зрабіць урок фізкультуры больш прывабным для дзяцей? Як адцягнуць дзяцей ад камп'ютара і прымусіць іх прыйсці ў спартыўныя залы? Ці патрэбныя ацэнкі па фізічнай культуры ў пачатковай школе? Адказы на гэтыя пытанні шукалі ўдзельнікі рэспубліканскага семінара «Укараненне камп'ютарных тэхналогій у практыку фізічнага выхавання навучэнцаў агульнаадукацыйных школ», які прайшоў на базе 121-й сталічнай сярэдняй школы. А галоўнай падзеяй семінара стала прэзентацыя электроннага вучэбна-метадычнага дапаможніка па баскетболе для вучняў 5—11-х класаў, аўтарства якога належыць супрацоўнікам Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.**

— На Сусветным алімпійскім кангрэсе, які прайшоў восенню мінулага года (а такія кангрэсы ладзяцца адзін раз у 10 гадоў), спартыўная грамадскасць планеты абазначыла два галоўныя прыярытэты ў развіцці сістэмы спорту — гэта здароўе моладзі і лічбавая рэвалюцыя, — паведаміў **генеральны сакратар Нацыянальнага алімпійскага камітэта Георгій КАТУЛІН**, які ўзяў удзел у семінары. — Ні для каго не з'яўляецца сакрэтам, што мы губляем нашых дзяцей: яны пакідаюць спартыўныя пляцоўкі і садзяцца за камп'ютары. Уплыў камп'ютараў на падрастаючае пакаленне настолькі магутны, што адарваць дзяцей ад іх ужо немагчыма. Значыць, у нас застаецца толькі адно выйсце — трэба паставіць камп'ютарныя тэхналогіі на службу сабе, каб далучаць з іх дапамогай дзяцей да спорту.

Трэба нагадаць, што пасля вяртання школы да 11-годкі і скарачэння тэрміну навучання давялося «ахвяраць» урокамі фізічнай культуры: іх колькасць скарацілася з трох да двух урокаў у тыдзень. Зразумела, не ўсіх гэта становішча задавальняе. Аднак на пажаданні ўдзельнікаў семінара вярнуць у школу трэці урок **намеснік міністра адукацыі Казімір ФАРЫНО** даў адназначны адказ — вяртання да трох урокаў фізічнай культуры не будзе. А пад спартыўна-аздараўленчыя мерапрыемствы трэба больш актыўна задзейнічаць шосты школьны дзень. Ці спрабаваць прыцягваць дзяцей на факультатыўныя заняткі, балазе, ужо ёсць зацверджаныя праграмы факультатыўных заняткаў па атлетычнай гімнастыцы, аэробіцы, дзюдо, футболе і тэнісе. Казімір Фарыно ўпэўнены, што для таго, каб зрабіць урок «Фізічная культура і здароўе» больш прывабным, трэба ўдасканальваць вучэбна-метадычнае забеспячэнне прадмета. І хоць пытанне выкарыстання на ўроках фізічнай культуры камп'ютарных тэхналогій успрымаецца даволі неадназначна, сёння ўжо зразумела, што нам без іх не абысціся.

**Дацэнты кафедры спартыўных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Віталь ХРАМАЎ** і **Валянціна НАВОЙЧЫК** не толькі расказалі, але і прадэманстравалі, як на практыцы могуць выкарыстоўвацца камп'ютарныя тэхналогіі на ўроках фізічнай культуры, а таксама ў фізкультурных гуртках і спартыўных секцыях пры навучанні дзяцей гульні ў баскетбол.

— Наш электронны дапаможнік, — расказвае Віталь Храмаў, — разлічаны на вучняў з 5-га па 11-ы класы школ. Ён уяўляе сабой спецыяльна падрыхтаваны праграмны дадатак, які ўключае ў сябе элементы так званага экраннага інтэрфейсу. Асноўны матэрыял захоўваецца ў ім у выглядзе відэа, тэксту і відэа, флэшанімацыі, тэксту і малюнкаў. Фактычна ўся гульня ў баскетбол раскладзена на асобныя складнікі, зразумелыя кожнаму вучню.

Агульнавядома, што пры паступленні ў ВНУ будучыя настаўнікі фізічнай культуры абавязкова здаюць спецыяльны экзамен, таму што нягледзячы на іх «прафілізацыю» ў нейкім адным з відаў спорту, на практыцы ў школе ім давядзецца дэманстраваць сваім вучням на ўласным прыкладзе элементы лёгкай атлетыкі і гімнастыкі, валоданне лыжамі і сакрэты гульнявых відаў спорту. Футбол, баскетбол, валейбол... Ці можа настаўнік быць «асам» ва ўсіх гэтых спартыўных дысцыплінах? На думку Віталя Храмава, настаўнік фізічнай культуры не заўсёды здольны на асабістым прыкладзе забяспечыць вучням якасную нагляднасць таго ці іншага рухальнага дзеяння. Узяць той жа баскетбол, які лічыцца вельмі складанай дысцыплінай: бег, скачок, атака баскетбольнага кальца і многія іншыя абавязковыя элементы... Нават калі настаўнік і здольны прадэманстраваць усе рухі якасна, то ўвага дзіцяці ўсё роўна не заўсёды паспявае фіксавацца на хуткіх рухах. Напрыклад, як ажыццяўляецца кідок у кальцо баскетбольнага мяча? Як пры ажыццяўленні кідка павінны рухацца каленныя і локцевыя суставы? Якім павінна быць пры гэтым палажэнне тулава ці палажэнне кісці? Ці можа настаўнік дваццаць—трыццаць разоў запар на працягу ўрока дэманстраваць сваім выхаванцам усе гэтыя рухі? А калі яму на дапамогу прыходзіць мультымедыйны праектар і камп'ютар, у педагога з'яўляецца магчымасць прадэманстраваць вучням эталонную тэхніку выканання гульнявых прыёмаў, прычым столькі разоў, колькі патрэбна, у замаруджаным і хуткім тэмпе, раскласці кожны рух на дробныя складнікі (на дзясятыя долі секунды), спыніць кадр і пакрокава аднавіць тыя ці іншыя дэталі. Усяго ў электронны дапаможнік увайшлі 580 кадраў. Выява транслюецца на вялікім экране на сцяне ў спартыўнай зале, і дзеці паўтараюць убачанае. Для таго, каб дзіця навучылася правільна абыходзіцца з мячом, прапануюцца практыкаванні, якія можна развучваць і дома, нават у малагабарытнай кватэры. Немалаважна і тая акалічнасць, што ў якасці эталону рухальныя дзеянні выконваюць дзеці адпаведнага ўзросту, а не, скажам, гульцы нацыянальнай зборнай, бо рухальныя дзеянні вядучых спартсменаў таксама не заўсёды адпавядаюць эталону. Да таго ж у дзяцей «уключаецца» спартыўны азарт — і я змагу зрабіць не горш, чым гэты хлопчык... Ёсць у дапаможніку тлумачэнне тактыкі гульні, тэсты для самадыягностыкі.

— Праводзіць урок з выкарыстаннем электроннага дапаможніка значна прасцей, паколькі можна рэалізоўваць рознаўзроўневы падыход для навучання, — падзялілася сваімі меркаваннямі з калегамі Валянціна Навойчык. — Больш моцныя вучні могуць рухацца наперад, выконваць больш складаныя заданні, а ў настаўніка з'яўляецца час, каб папрацаваць з больш слабымі вучнямі індывідуальна, дапамагчы ім, адкарэктаваўшы іх праблемы. І не трэба павышаць голас, каб перакрычаць «суседзяў», бо сёння вельмі часта ў спартыўнай зале адначасова праводзяцца ўрокі па фізічнай культуры адразу ў некалькіх класах. І працаваць у такой атмасферы настаўніку вельмі складана... Ёсць магчымасць павысіць маторную шчыльнасць урока, якая звычайна пры развучванні новых складаных рухаў істотна зніжаецца.

Універсальнасць гэтага электроннага дапаможніка заключаецца ў тым, што яго карыстальнікамі могуць быць не толькі настаўнікі, але і навучэнцы і іх бацькі. Яго можна выкарыстоўваць як на ўроках, так і ў спартыўных секцыях, і для ўласнага навучання. Прычым Віталь Храмаў упэўнены, што выпуск электроннага дапаможніка на ліцэнзійных DVD-дысках — не лепшае рашэнне. Трэба ствараць спецыялізаваны партал, дзе ўся патрэбная педагогам і бацькам інфармацыя будзе знаходзіцца ў свабодным доступе, і дзе можна будзе наладзіць прамы дыялог паміж аўтарамі праграмнага прадукту, педагогамі і бацькоўскай грамадскасцю.



У бліжэйшы час электронны дапаможнік па баскетболе павінен будзе прайсці навукова-педагагічную экспертызу і апрабацыю на базе гродзенскіх і мінскіх школ. Цікава будзе паглядзець, наколькі настаўнікі фізічнай культуры гатовы да выкарыстання электронных сродкаў навучання на сваіх уроках, бо можна даць педагогу праграмны прадукт, а якасць урокаў ад гэтага толькі пагоршыцца. Зразумела, што ёсць настаўнікі, асабліва новай фармацыі, якія з камп'ютарнай тэхнікай на «ты», аднак ёсць і іншая катэгорыя настаўнікаў. Магчыма, спатрэбіцца курсавая перападрыхтоўка. Відавочна адно — спартыўна-педагагічная інфарматыка будзе развівацца і далей, і сёння ўжо выдзелены сродкі для падрыхтоўкі электронных дапаможнікаў яшчэ па пяці відах спорту, у тым ліку па плаванні, футболе і валейболе.

Але вось яшчэ пытанне: ці хопіць у школах абсталявання для ўкаранення навацый? Калі на ўсю школу прыпадаюць толькі два экраны і адзін праектар, то трэба будзе станавіцца ў чаргу на гэту тэхніку! І хто будзе займацца ўкараненнем перадавых методык навучання на раённым ці абласным узроўні, калі службовы аклад метадыста ў аддзеле адукацыі складае на сённяшні дзень 265 тысяч 200 рублёў — гэта менш пражытковага мінімуму. Пры гэтым метадыстам забаронена займацца выкладаннем у свой асноўны рабочы час.

Наконт намеру па ўкараненні ў пачатковай школе безадзнакавага навучання па фізічнай культуры і выяўленчым мастацтве ўдзельнікі семінара, сярод якіх былі і прадстаўнікі Міністэрства спорту і турызму, выказаліся аднадушна: любая дзейнасць вучня павінна ацэньвацца. Ацэнка — гэта свайго роду стымул. А вось якія крытэрыі будуць пакладзены ў аснову гэтай ацэнкі — гэта ўжо зусім іншае пытанне. Нельга, каб вучань адчуваў сябе на ўроках некамфортна, комплексаваў, скажам, з-за сваёй лішняй вагі. Магчыма, трэба распрацоўваць альтэрнатыўныя кантрольныя практыкаванні, каб любы вучань мог самастойна выбраць з прапанаванага пераліку той тэст, які яму найбольш падабаецца. Прагучала нават прапанова ўвесці дадатковы бал за наведвальнасць урокаў фізкультуры.

Напрыканцы семінара намеснік міністра адукацыі Казімір Фарыно паставіў канкрэтную задачу — да новага навучальнага года электронны дапаможнік па баскетболе павінен трапіць у школы.

## ШКОЛА ДЛЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

250 прадстаўнікоў рэдкалегій студэнцкіх газет з 38 беларускіх ВНУ запрошаны ў «Зімовую школу студэнцкай журналістыкі», якая адкрываецца на базе спартыўна-аздараўленчага комплекса БДУ «Брыганціна» 19 лютага. У праграме «Зімовай школы» — майстар-класы па аператарскім майстэрстве і ўменні працаваць у кадры, трэнінг па эфектыўным узаемадзейнічанні ў камандзе, публічныя выступленні студэнтаў са сваімі праектамі на інтэрактыўнай канферэнцыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Клуб юнкараў

# ШЧАСЦЕ НА КАРОТКІХ НОЖКАХ

Гэту караткаdebugжку з вялізнымі і надта разумнымі вачыма і так не падобную на іншых прадстаўнікоў сабачага племя ўсё часцей можна сустрэць на мінскіх вуліцах. Шчаняты-бульдожкі карыстаюцца вялікім попытам, хоць набыць такога сябра сабе не кожны дазволіць. Англійскія бульдогі каштуюць 400—450 долараў (!). Але гэта парода становіцца ўсё больш папулярнай. Чым гэты кірпаты гадаванец (які, дарэчы, лічыцца адным з сімвалаў брытанцаў) скарае беларусаў?

Мая знаёмая расказала мне такую гісторыю. Аднойчы яе сын Вова ўвечары пайшоў выгульваць бульдога Рума. Яны любілі доўга гуляць, таму маці і не захвалявалася, калі праз гадзіну сын не вярнуўся. Вова прыйшоў дамоў увесь у драпінах і сіняках, у парванай вопратцы, першае, што падумала маці: «Няўжо Рум не змог абараніць ад хуліганаў сына?». Але насамрэч было зусім інакш. Вова і Рум гулялі на пустэчы, хлопчык не заўважыў адкрыты люк і праваліўся туды, але павадок застаўся ў яго руцэ. Цяжка паверыць, але хлопчыка з люка выцягнуў... сабака. Рум заціснуў у сваіх магутных сківіцах павадок і цягнуў яго, пакуль хлопчык не вылез з люка.

Каб больш даведацца пра кірпатую пароду, я сустрэлася з сапраўдным знаўцам бульдогаў Светай Антыпавай, у якой дома жывуць тры такія чатырохногія сябры.

— Асаблівасць гэтай пароды — вельмі моцная эмацыйная адданасць чалавеку. Па-першае, калі бульдог бачыць, што ў гаспадара дрэнны настрой, то абавязкова будзе ўсімі спосабамі спрабаваць яго ўзняць: ці пачне смешна віляць хвастом, ці нос чалавеку лізаць, ці яшчэ што, абы развесяліць. Па-трэцяе, англійскі бульдог — гэта байцоўскі сабака і абараніць зможа без цяжкасцяў, але ніколі не накінецца на чалавека проста так. Для гаспадара — гэта лепшы і надзейны абаронца.

***— А як ужываюцца разам тры байцоўскія сабакі?***

— Яны выдатна ўжываюцца не толькі адзін з адным, але і з усімі хатнімі жывёламі. А яшчэ яны вельмі любяць дзяцей, бо разумеюць, што малы ў сям'і — аб'ект усеагульнай любові. Гэтых сабак цяжка вывесці з раўнавагі, што ператварае іх у незвычайна прыемных спадарожнікаў.

***— А якога догляду патрабуюць англійскія бульдогі?***

— Нягледзячы на тое, што гэтых сабак прававерна лічаць «джэнтльменамі», бо ім уласціва мэтанакіраванасць, рашучасць, моц і разам з тым стрыманасць і арыстакратызм, яны не патрабуюць каралеўскага догляду. Поўсці ад іх не шмат, выдатна абыходзяцца без далікатэсаў, непераборлівыя, устойлівыя да хваробаў.

***— Якую вы дасце параду людзям, якія хацелі б набыць сабе сабаку, але пакуль не вызначыліся з выбарам пароды?***

— Усё ж такі кожны павінен выбіраць, які сабака яму бліжэй па духу. Самы важны крытэрый выбару — гэта ўнутраны голас, інтуіцыя, любоў з першага погляду. Што датычыцца бульдогаў, то мала хто з людзей, якія мелі ў сябе такіх сабак, набываюць іншую пароду. А многія заводзяць двух, а то і трох бульдогаў.

**Наталля КІРУШКІНА,**
**вучаніца 217-й школы г. Мінска.**

# Колькі каштуе клубны адпачынак?..

Як бы ні «даставаў» крызіс, клубаў для адпачынку моладзі менш не становіцца. Наадварот, іх колькасць расце. Калі раней адкрыццё любога неблагога клуба было падзеяй, то цяпер — гэта толькі прычына для звычайнага ўзгадвання падчас размовы.

Але, як гэта ні дзіўна, чым больш адчайнае зацішша, тым мацнейшым будзе ўсплёск. Натуральна, у грашовым эквіваленце.

Нашы патрабаванні да клубаў такія ж высокія, як і цана, якую мы гатовыя заплаціць. Тым больш што плаціць мы прывыклі. Сёння кошт уваходу ў клуб фарміруе яго аблічча, элітарнасць, значнасць і ўнікальнасць, з-за чаго паняцце «чым даражэй, тым лепш» не знікае...

Здавалася б, новае тысячагоддзе павінна дадаць розуму, але, на жаль, няшмат чаго змянілася з часоў легендарнай «Студыі-54» у клубным жыцці свету. Але менавіта грошы адчыняюць перад вамі ўсе зачыненыя дзверы.

Колькі каштуе адпачыць? І колькі патрэбна для таго, каб не плаціць зусім?

Мінск, як і любая сталіца, ажывае ўначы. Безаблічныя твары, шэрасць, абыякавасць і сціпласць знікаюць. На змену прыходзяць бляск, лепшае адзенне, упэўненасць і жаданні. Горад пераўвасабляецца, прагне весялосці. І ні для каго не сакрэт, што клуб шмат чаго абяцае. Запатрабаванні растуць, цана грашам губляецца, расстаўляюцца розныя прыярытэты.

Але гэта пазней, а для пачатку важна трапіць у гэтую «Меку «выбраных». Сёння мінскія клубы стракацяць сваёй рэкламай, прывабнымі прапановамі, акцыямі і ўнікальнымі вечарынкамі, такімі, «якіх свет яшчэ не бачыў». Акрамя таго, бясплатны ўваход для дзяўчат да паўночы, бясплатны кактэйль, зніжкі па флаеры...

Ёсць і іншыя бонусы. Але часта адбываецца так, што зніжак ніякіх няма, а бясплатны ўваход толькі для тых, хто сябруе з ахоўнікам. «Чакайце, калі ласка» — стандартная фраза на ўваходзе ў клуб. Вядома ж, да таго, як праб'е 00:01, і ўжо хочаш, ці не, а заплаціць давядзецца.

У выніку атрымліваецца, што ў большасці за ўваход плацяць усе. А гэта ў сярэднім па Мінску — 20—30 тыс. рублёў... Дарэчы, не так і шмат за адпачынак, але ўсё ж, калі ўспомніць Еўропу і тую ж Амерыку, уваход у любы клуб — «0» у любой валюце. Не заплаціўшы за ўваход, чалавек з задавальненнем патраціць гэтыя грошы ў бары. А плата толькі за памяшканне, на мой погляд, перажытак мінулага, ад якога трэба пазбаўляцца.

І калі б гэта было ўсё. Бо перш чым заплаціць за ўваход (або, калі атрымаецца, трапіць бясплатна) неабходна прайсці Face-control, гэта значыць — выглядаць стыльна, соўкай ці што. Не заплаціўшы, не ўбачыш знакамітага дыск-жакея, не патанчыш пад сусветныя сэты, не здзівішся тэматычна аформленаму ў сувязі з вечарынкай клубу. Проста прыемна правядзеш час.

Але праблема і тут хаваецца не толькі ў жаданні зэканоміць на ўваходзе, а, хутчэй, у тым, што добрыя вечарынкі ў Мінску і цяпер — рэдкасць. Нават заплаціўшы, і нават шмат, не факт, што тое, што атрымаеш, у выніку супадзе з апісаннем на рэкламным флаеры. Як пашанцуе.

Вось і атрымліваецца, што калі ты не знакамітасць, то раскашэліцца давядзецца. А ў клубы цягне,



калі казаць іначай — вельмі дарага. У нас любяць, калі «ну вельмі дарага». Тут і атрымліваецца, што да тратаў на клуб умоўна дадаюцца траты на знешні выгляд. Гэта нядрэнна, зразумела, але факт застаецца фактам: калі ты актыўны «тусоўшчык», адной прыгожай сукенкай ці стыльнай кашуляй сапраўды не абысціся.

Але не ўсё так сумна, як здаецца. Мы — развіваемся. Адзінкава, праўда пакуль, але ў апошні год некаторыя папулярныя клубы Мінска ці абзавяліся разумнымі арт-дырэктарамі, ці ў Еўропу пракаціліся, але сталі практыкаваць абсалютна бясплатныя вечарынкі. У «Белай Вежы», напрыклад, «Dj Bar». Тут і выбар ёсць: не падабаецца, можна і з'ехаць, а заплаціўшы, неяк шкада адразу пакідаць клуб.

Вядома, гэтага мала. Але крок наперад ён і ёсць — наперад. Толькі вось пра якасць пакуль нават і гаворкі не ідзе. Калі бясплатна, то ўжо неяк «згамтана», сваёй тусоўкай бурліць. Таму апранаем пухнатыя паланціны і вядзём свецкае начное жыццё.

**КОШТЫ ЎВАХОДУ Ў НАЙБОЛЬШ ВЯДОМЫЯ КЛУБЫ МІНСКА (СЯРЭДНІЯ):**

«Белая Вежа» — 20 тыс. рублёў. Да поўначы дзяўчатам — бясплатна. Па картках — бясплатна.

«Афрыка» — 25 тыс. рублёў. Звычайна да поўначы дзяўчатам — бясплатна, хлопцам — зніжка. Па картках — бясплатна.

«НЛА» — для дзяўчат — 20 тыс., для хлопцаў — 30 тыс. рублёў.

«Тытан» — 25 тыс. рублёў.

«Times» — 25 тыс. рублёў. Да поўначы дзяўчатам — бясплатна.

«Roxy Club» — 15 тыс. рублёў. Да поўначы дзяўчатам — бясплатна.

«Арыён» — 15 тыс. рублёў. Да поўначы дзяўчатам — бясплатна.

«Fabrique» — 25 тыс. рублёў. Па флаерах — зніжка.

**Дзіяна АРЫПАВА.**

Хочаце — верце...

# НОГІ, КРОКІ І ХАРАКТАР

**Псіхолагі канстатуюць узаемасувязь паходкі, шырыні кроку падчас хадзьбы з пэўнымі рысамі характару і псіхічным станам чалавека. Асабліва яскрава гэта праяўляецца ў жанчын.**

Напрыклад, ісці, засунуўшы рукі ў кішэні, можа чалавек ці празмерна крытычна настроены (як да сябе, так і да іншых людзей), ці той, на каго зваліліся сур'ёзныя праблемы, з якімі ён не ў стане справіцца самастойна. Праўда, прыгнечаны чалавек крочыць не проста засунуўшы рукі ў кішэні, а пры гэтым яшчэ «цягне» ногі і пазірае ўбок, а не туды, куды накіроўваецца. Не трэба імкнуцца з ім загаварыць, а тым больш вырашаць сумесна нейкія справы. Бесперспектыўна.

Калі вы бачыце імклівую паходку, пры гэтым рукі пешахода ўпёрты ў клубы, значыць, перад вамі вельмі неўраўнаважаная натура. Успышкі энергіі ў яе змяняюцца доўгімі перыядамі апатыі. З такімі людзьмі трэба вырашаць пытанні хутка, ці цярпліва — крок за крокам — падштурхоўваць іх да патрэбнай вам мэты.

Павольная паходка з частымі спыненнямі (піхнуць камяньчык, паглядзецца ў лужыну), плюс апушчаная галава і счэпленыя за спінай рукі сведчыць аб тым, што чалавек заняты вырашэннем нейкай праблемы і яму зараз не да вас.

Высока ўзняты падбародак, энергічныя рухі рукамі і крыху «здранцвелыя» ногі могуць указаць, што перад вамі адказны чыноўнік ці кіраўнік. Ён заўсёды заняты і заўсёды лічыць сябе незаменным і важным.

Спраўная постаць, «пругкая» паходка і скупыя рухі рукамі, як правіла, характэрныя для ваенных ці спартсменаў, хай сабе і былых.

Чалавек, які заўсёды ідзе ўпэўнена па прамой, звычайна смелы і мудры. Ён любіць спорт, можа быць прафесійным спартсменам. Ён прамалінейны ў выказваннях, што прыносіць яму мноства непрыемнасцяў.

Той, хто ходзіць ціха, з узнятым падбародкам, — горды, задумлівы, фанабэрысты. Хто пры гэтым прыпыняецца і незаўважна аглядаецца — можа аказацца самаўлюбёным ганарлівым паклёпнікам.

Невялікі нахіл цела пры хадзьбе — прыкмета шчырага, міралюбівага і дабрадзейнага чалавека.

Той, хто ходзіць у хуткім тэмпе і пры гэтым робіць размашыстыя доўгія крокі, — велікадушны, славалюбівы, выканальны. Ён заўсёды давядзе да канца распачатую справу.

Ціхая паходка з размераным крокам бывае ў разважлівага славалюбівага і эгаістычнага чалавека.

Хуткая і ціхая паходка бывае ў прытворшчыка.

Паходка з кароткімі крокамі бывае ў чалавека злапамятнага, злобнага, ненадзейнага. Ганарлівыя, амбіцыйныя людзі пры хадзьбе дрыгаюць усім целам, асабліва плячамі.

Людзі нясмелыя, некамунікабельныя ходзяць наскамі ўнутр.

Шчаслівыя ў каханні жанчыны маюць лёгкую прыгожую паходку.

Размашыстая паходка бывае ў чалавека гаваркога, смелага, кантактнага, які лічыць сябе разумным. Жывая жэстыкуляцыя гаворыць аб яго самаўпэўненасці і імпульсіўнасці. Народжанага ў снежні эмоцыі проста «захлістваюць», ён можа глытаць словы, пераскокваць у размове з тэмы на тэму, гаворыць неразборліва. Такія людзі — аптымісты, часта дабіваюцца поспеху ў кар'еры.

Звычка схіляць галаву злёгку ўправа, шырока расстаўляць ногі падчас хады, пры гэтым энергічна размахваць рукамі, класці руку на клуб і глядзець прама на суразмоўцу — ўсё гэта прыкметы высакароднасці натуры. Такія людзі ўдачлівыя ва ўсіх пачынаннях, яны адкрытыя, шчырыя, камунікабельныя, з аналітычным складам розуму і задаткамі псіхолага.

## Рэцэпт правільнай паходкі

Калі ставіце нагу на зямлю, спачатку трэба дакрануцца пяткай, а потым плаўна перанесці ўпор на сярэднюю і затым — на пярэднюю частку стапы. У кроку павінна ўдзельнічаць уся стапа ад пяткі да наска. Але рух павінен быць плаўным, ствараць ілюзію «перацякання». Тады паходка будзе выглядаць пругкай і свабоднай.

Акрамя таго, у руху павінна ўдзельнічаць уся нага ад бядра. Корпус трымаем прама, падбародак злёгку прыўзняты, плечы «разгорнуты». Галавой пры кожным кроку ківаць не трэба. Як і паглядаць на ўласныя наскі. А вось навучыцца ставіць іх крыху ў бакі — неабходна.

Зразумела вялікі ўплыў на паходку аказвае абутак. Калі ён нязручны, вузкі, цесны, некамфортны, усе вашы намаганні будуць дарэмнымі.

## Хто як стаіць

Чалавек, які мае звычку стоячы абапірацца ўсёй вагой на адну нагу, а другой абапірацца толькі на абцас, звычайна не паслядоўны ў кантактаванні, любіць весяліцца ў кампаніі, некалькі катэгарычны ў выказваннях, схільны да навязвання сваіх поглядаў. У некаторых людзей такая поза служыць метадам маскіроўкі нясмеласці і няўпэўненасці ў сабе.

Чалавек, які звычайна стаіць, скрыжаваўшы ногі, абапіраючыся ўсёй масай на адну нагу, а другую ставіць на насок, не ўпэўнены ў сабе, пасуе перад цяжкасцямі. Для яго характэрнымі рысамі з'яўляюцца асцярожнасць, падазронасць, што вельмі ўскладняе кантактаванне з людзьмі — і ў сям'і, і на працы.

Поза, пры якой ногі ставяць так, каб наскі сутыкаліся, сведчыць аб інфантылізме.

Поза «пяткі разам, наскі разведзены» характарызуе дзелавога чалавека, рэаліста і рашучага прагматыка, здольнага ў патрэбны момант даць адпор. На яго заўсёды можна палажыцца, хаця яго залішняя нецярплівасць вельмі ўскладняе ўсім жыццё і ў першую чаргу — яму самому.

Спартыўная стойка — ногі на шырыні плячэй (адна можа быць крыху наперадзе ці адстаўлена ўбок, другая — ззаду) больш гаворыць не аб характары чалавека, а аб тым, што ён вельмі стаміўся і яму не да кантактавання.

## Характар і даўжыня ног

Людзей з кароткімі нагамі прынята лічыць рэалістамі і прагматыкамі. Яны вынослівыя і жыццярадасныя. Са сваімі штодзённымі праблемамі спраўляюцца «на выдатна». У іх пераменлівы настрой: толькі што яны выпраменьвалі радасць, а праз імгненне сталі цямней змрочнай хмары. Такія людзі схільныя да меланхоліі.

А вось людзі з доўгімі нагамі — натуры рамантычныя і летуценныя ад прыроды. Пры гэтым яны валодаюць дастаткова цвёрдымі прынцыпамі, ад якіх вельмі неахвотна адмаўляюцца.

## Як сцёрты ваш абутак?

У чалавека ўраўнаважанага абцас і падэшва сцёртыя ў аднолькавай ступені. Такі абутак можа належаць выдатнай гаспадыні, выканаўчаму служачаму, паспяховаму прадпрымальніку.

Калі падносак зношаны з вонкавага краю, хутчэй за ўсё, такі абутак носіць чалавек рашучы і прамы, які ўмее арыентавацца ў любой сітуацыі, але схільны да неаб'ектыўнасці.

Пацёртасць на ўнутраным краі падэшвы ўласціва для абутку фізічна слабых людзей, якія валодаюць глыбокім розумам. Такі чалавек заўсёды знаходзіцца ў роздуму і мала ўвагі надае таму, што адбываецца навокал.

Калі моцная пацёртасць наглядаецца пад вялікім пальцам стапы, значыць, перад вамі рашучы чалавек, які дзеля дасягнення сваёй мэты не спыніцца ні перад чым. У кантактаванні з іншымі людзьмі ён можа быць жорсткім і грубым.

Бывае, што падэшва знасілася пасярэдзіне, а абцас — з унутранага краю. Такі абутак належыць чалавеку з мяккім характарам, які заўсёды гатовы саступіць, нікому не чыніць крыўды, іншых не прыніжае.

А калі падносак сцёрты ў раёне наска, а абцас — з вонкавага краю, значыць, абутак належыць летуценніку, які празмерна засяроджаны на сваёй мары. Адказнасці такі чалавек пазбягае ўсімі спосабамі.

**Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.**



# ЗОРКІ ХАКЕЯ

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Канады

# КАМУ СВЕЦЯЦЬ У ВАНКУВЕРЫ, А КАМУ — І НЕ

Здавалася б, што яшчэ нядаўна ў Ванкуверы кіпелі сапраўдных жарсці аб падрабязнасцях і сакрэтах адкрыцця зімовых Алімпійскіх гульняў, а ўжо неяк непрыкметна Алімпіяда наблізілася да сярэдзіны.

Пасля невыразнага выступлення айчынных лыжніц — у жанчын на 10 км і ў мужчын на 15 км свабодным стылем, учарашні дзень для беларускай каманды ў нейкім сэнсе быў момантам ісціны, бо нашы біятланісты маглі ўвасобіць медальныя мары ў рэальнае жыццё. Праўда, на момант падпісання газеты ў нумар падзеі на стрэльбішчы і на трасе ў Віслерскім алімпійскім парку толькі пачыналі развівацца. Таму падрабязнасці жаночай і мужчынскай гонак праследавання на 10 км і 12,5 км адпаведна — у наступным нумары.



Настаўнік фрыстайліста Мікалай КАЗЕКА: наша мэта — алімпійскі медаль.

Пакуль жа размова пра хакей. Увесь сусветны бамонд, які з'ехаўся ў Ванкувер, не перастае абмяркоўваць рэаліі сённяшняга дня. А яны больш чым вясёлкавыя. Сабраць пад адным дахам у Канадзе столькі расійскіх і мясцовых зорак планетарнага маштабу — дарагога каштуе. Калі яшчэ можна будзе ўбачыць разам расіян Авечкіна, Малкіна, Дацюка, Сёміна, Казлова, Кавальчука, а з канадцаў — Кросбі, Хітлі, Бродэра, Нідэрмаера? У сувязі з такім ажыятажам, няцяжка здагадацца, уваходных білетаў на большасць матчаў, у тым ліку і з удзелам беларускай каманды, якая заўтра гуляе з фінамі, няма.

Пра гэта добра ведаюць і перакупшчыкі. Адзін з іх раніцай на асноўнай лініі ванкуверскага метро «Канада лайн» заклікаў пасажыраў купіць сапраўдны білет на хакей. Напрыклад, на матч Беларусь — Фінляндыя. Кошт — усяго 140 канадскіх долараў. Я са сваім калегам з іншай беларускай газеты пацікавіліся сапраўдным кошце білета на хакей. Усё ў парадку, сказаў славацкі «прадпрымальнік» Раман. Вось дата, залацістае цісненне. Хвілінай пазней высветлілася, што свае паслугі гэты прадавец прапаноўваў і на леташнім чэмпіянаце свету ў швейцарскім Цюрыху. Мы ўспомнілі адзін аднаго, праўда, да абдымкаў справа не дайшла. Работа ў нас такая, падкрэсліў славак. Сёння тут, заўтра — там. Чаму не зарабіць, калі ёсць магчымасць. І сапраўды, пры намінальным кошце хакейнага білета ў 80 канадскіх долараў «зліць» яго за 140 — амаль 100-працэнтны прыбытак. «Калі трэба арыгінальныя квіткі на фінал, а па папярэдніх звестках у матчы Канада — Расія кошт на білеты будзе вагацца ў межах некалькіх тысяч мясцовых долараў, арганізуем, — зрабіў заключэнне даўні знаёмы. — Пры неабходнасці магу прапанаваць любыя білеты і ў любой колькасці на матчы чэмпіянату свету па футболе ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы».

Вось гэта размах. І хто сказаў, што сёння на дварэ сусветны эканамічны крызіс?

Між тым учора была магчымасць наведацца на трэніроўку беларускай зборнай. Міхаіл Захараў напярэдадні раскаткі арганізаваў фотасесію гульцоў, удзельнікам якой стаў і карэспандэнт «Звязды». Паўтарагадзінны спарынг паміж сабой прынёс задавальненне настаўніку беларусаў. Праўда, Міхаіл Міхайлавіч не пераставаў выказваць журналістам пажаданні, што ў Кантынентальнай хакейнай лізе павінны быць два айчынныя клубы, а не адзін — тады будзе з каго выбіраць гульцоў для самых важных матчаў, што чакаюць нас у Ванкуверы. А так, працягваў Захараў, яшчэ шмат праблем у абароне, аб чым сведчыць апошні пройгрыш у таварыскай сустрэчы швейцарцам, дзе нам закінулі аж шэсць шайбаў. А пра нападзенне і казаць няма чаго: Міхаіл Грабоўскі з «Таронта» гуляць не будзе — выступіць толькі ў якасці балельшчыка. На жаль, давялося выключыць са спіска 23 і форварда «Манрэаль Канадзіенс» Андрэя Касціцына. У межах лядовай хакейнай школы «Брытанія Цэнтр», дзе праходзіла раскатка і прыстрэлка беларусаў, Касціцына старэйшага суправаджала жонка Таццяна з дачкой Валерыяй. Таццяна вельмі расхвалялася за Андрэя, калі даведалася, што яе мужу давядзецца быць удзельнікам цяперашняга топ-турніру толькі ў ролі балельшчыка. Што зробіш — старая траўма калена, якую Андрэй атрымаў у чэмпіянаце НХЛ яшчэ напярэдадні новага года, не залечана.

Пры усёй не самай прыемнай раскладцы, зрабіў заключэнне Міхаіл Захараў, яго падначаленыя прыкладуць максімум намаганняў, каб парадаваць беларускіх балельшчыкаў дабротнай і выніковай гульнёй. Сярод найбліжэйшых задач — прабіцца ў плэй-оф турніру, а потым і ў васьмёрку мацнейшых.

У адрозненне ад хакеістаў, мужчынская і жаночая каманда па фрыстайле поўная аптымізму пазмагацца за медалі Алімпіяды-2010. Пра гэта журналіст «Звязды» можа меркаваць пасля гутаркі з галоўным трэнерам Мікалаем Казекам. Ён адзначыў, што каманда ўжо на другі дзень пасля прыезду паспела азнаёміцца з трамплінам, на якім давядзецца выступаць «паветраным» акрабатам. Праўда, Мікалай Іванавіч падкрэсліў, што на сёння канкурэнцыя ў фрыстайлістаў-скакуноў такая, што загадваць нешта наперад немагчыма. Але ж мэта пастаўлена — заваяваць медаль. Зрэшты, паводле слоў Мікалая Казекі, любы з удзельнікаў беларускай каманды — Дзмітрый Дашчынкі, Антон Кушнір, Аляксей Грышын, Асоль Слівец, Ала Цупер — пры ўдалым раскладзе могуць стаць уладальнікамі ўзнагародаў. Але для гэтага трэба, каб карта лягла правільна: і лаяльныя адносіны арбітраў, і высакабальны скачок, і чыстае прызямленне. На трэніроўках, сказаў на заканчэнне Мікалай Іванавіч, фрыстайлісты робяць цуды. Хацелася, каб яны і на самых важных у іх жыцці спаборніцтвах не спасавалі перад знакамітымі супернікамі і паказалі ўсё, на што здатныя.

Мы ўзялі абяцанне, што акажам самую цёплую падтрымку беларускім спартсменам. Пры гэтым не сумняваемся, што колькасць беларусаў, якія будуць хварэць на алімпійскіх аб'ектах за сваіх землякоў, не будзе абмяжоўвацца толькі членамі беларускай дэлегацыі. За тыдзень знаходжання ў Ванкуверы на яго вуліцах і на спартыўных арэнах удалося сустрэць не адзін дзясятак «эмігрантаў»,



Жонка форварда «Манрэаль Канадзіенс» і зборнай Беларусі Андрэя Касціцына Таццяна разам з дачкой Валерыяй будуць хварэць за беларусаў.

прычым вельмі маладых людзей. Напрыклад, 25-гадовы мінчанін Аляксандр будзе хварэць за нашых, а не за амерыканцаў, хоць ужо 5 гадоў як жыве ў Сіэтле, што за 220 кіламетраў ад Ванкувера, і працуе менеджарам у кампаніі Coca Cola. Сюды ён прыехаў у рамках партнёрства знакамітага сусветнага брэнда з Міжнародным алімпійскім камітэтам. А вось як у такім маладым узросце перабраўся за акіян?

Усё проста, расказаў беларус, які працуе на алімпійскіх аб'ектах зімовай Алімпіяды ў складзе 160 шчасліўчыкаў з усяго свету. Яшчэ 5 гадоў па Грын-карце цераз Маскву ён адправіўся на агледзіны ў ЗША. Там і прыжыўся, хоць і застаецца ў душы сапраўдным беларусам.

Намнога складаней уладкаваць сваё жыццё нашым маладым землякам, якія не маюць статусу перакладчыка ці менеджара з добрымі ведамі англійскай мовы. У гэтым мы з калегам упэўніліся, калі ў навакольлі Міжнароднага прэс-цэнтра сустрэлі зямлячку. Маладая пара з Брэста таксама пакінула межы радзімы праз безвыходнасць, атрымаўшы ў Канаду звычайную рабочую візу. На руках двое дзяцей, хлопцы. Адзін — Ягор — сапраўдны беларус, бо нарадзіўся на радзіме, а другі — Рычард — нарадзіўся ў Канадзе. Дык вось гэтая маладая сям'я працуе ў Ванкуверы на будоўлі. Скаргі ад іх за жыццё нам чуць не давялося, хоць ноткі настальгіі падчас размовы праскоквалі. Тым не менш, запэўнілі канадскія беларусы, на кожных спартыўных спаборніцтвах, якія працягнуцца да 28 лютага, яны будуць імкнуцца трапіць, найперш — з удзелам беларускіх спартсменаў.

Мы чамусьці і не сумняваемся, што ўся беларуская дыяспара ў Ванкуверы і яго прыгарадзе не пашкадуе гарачых эмоцый і апладысментаў, каб паспрыяць поспеху айчынных алімпійцаў.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**
*Ванкувер, Канада*

**15 лютага на Алімпійскіх гульнях у Ванкуверы было разыграна 6 камплектаў медалёў. Колькасць краін, якія вызначыліся на XXI Гульнях, павялічылася да дваццаці. Лідарства ў агульным заліку захапілі швейцарцы, якія двойчы святкавалі перамогу. Амерыканцы ўзначальваюць рэйтынг па агульнай колькасці ўзнагародаў, павялічыўшы яе да васьмі.**

## ЛЫЖНЫЯ ГОНКІ

Першымі ўзнагароды разыгралі лыжніцы ў гонцы на 10 км вольным стылем. Перамогу святкавала шведка Шарлота Кала (24.58,4), сярэбраны медаль заваявала эстонка Крысціна Шмігун (+6,6 сек.), «бронза» дасталася нарвежскай лыжніцы Марыт Б'ёрген (+15,9 сек.). Лепшай з беларусак была Алена Саннікава, якая заняла 44-е месца (адставанне — 2 хвіліны 22,9 сек.). Вольга Васілёнак стала 56-й, Кацярына Рудакова — 59-й.

У мужчын у 15-кіламетровай гонцы вольным стылем перамогу святкаваў швейцарац Дарыо Калонья з вынікам 33 хвіліны 36,8 сек. Другім фінішаваў італьянец П'етра Пілер Котрэр, «бронзу» заваяваў чэх Лукаш Бауэр. Лепшым сярод беларусаў быў Сяргей Далідовіч, які размясціўся на 35-м месцы з адставаннем 1 хвіліна 53,1 сек. Аляксей Іваноў фінішаваў 60-м, Леанід Карніенка — 63-м.

## ГОРНЫЯ ЛЫЖЫ

Гарналыжнікі нарэшце разыгралі камплект узнагародаў у хуткасным спуску. Алімпійскім чэмпіёнам стаў швейцарац Дзідзье Дэфага, які паказаў вынік 1 хвіліна 54,31 сек. «Серабро» дасталося нарвежцу Акселю Лунду Свіндалю, амерыканец Бодэ Мілер выйграў «бронзу».

## СНОЎБОРД

Сноўбардысты выявілі наймацнейшага ў борд-кросе. Перамогу святкаваў амерыканец Сэт Уэскат. У фінале ён абышоў канадца Майка Робертсана і француза Тоні Рамана, якія занялі другое і трэцяе месцы. Сэт Уэскат паўтарыў свой поспех чатырохгадовай даўнасці ў Турыне і стаў двухразовым алімпійскім чэмпіёнам.

## КАНЬКАБЕЖНЫ СПОРТ

Спаборніцтвы канькабежцаў на дыстанцыі 500 м завяршыліся перамогай паўднёвакарэйца Тай Бум Мо (69,82 сек.). «Серабро» дасталося японцу Кейчыра Нагасіма, «бронза» — яго суайчынніку Ёдзі Ката. Арганізатарам турніру прыйшлося сутыкнуцца з непрыемнымі нечаканасцямі — падчас заліўкі лёду зламалася адна з машын і спаборніцтвы давялося адкласці.

## ФІГУРНАЕ КАТАННЕ

У фігурным катанні быў разыграны першы камплект узнагародаў. Спаборніцтвы спартыўных пар завяршыліся вольнай праграмай. Алімпійскімі чэмпіёнамі сталі кітайцы Шэнь Сю і Чжао Хонбо, якія набралі ў суме 216,57 балаў. Другое месца заняла яшчэ адна кітайская пара Пан Цынь і Тон Цзянь. Нямецкі дуэт Алёна Саўчанка і Роберт Шалковы заваяваў «бронзу». Не спраўдзіліся медальныя надзеі расіян — чэмпіёны Еўропы Юка Кавагуці і Аляксандр Смірноў, якія пасля кароткай праграмы займалі трэцяе месца, апусціліся ў выніку на чацвёртае з-за падзення партнёршы падчас выканання вольнай праграмы.

| Краіна | Золата | Серабро | Бронза | Усяго |
|---|---|---|---|---|
| 1. Швейцарыя | 3 | 0 | 0 | 3 |
| 2. ЗША | 2 | 2 | 4 | 8 |
| 3. Паўднёвая Карэя | 2 | 1 | 0 | 3 |
| 4. Францыя | 2 | 0 | 2 | 4 |
| 5. Германія | 1 | 3 | 1 | 5 |
| 6. Канада | 1 | 2 | 1 | 4 |
| 7. Кітай | 1 | 1 | 0 | 2 |
| 8. Чэхія | 1 | 0 | 1 | 2 |
| 9. Галандыя | 1 | 0 | 0 | 1 |
| — Славакія | 1 | 0 | 0 | 1 |
| — Швецыя | 1 | 0 | 0 | 1 |
| 12. Нарвегія | 0 | 2 | 1 | 3 |
| 13. Італія | 0 | 1 | 2 | 3 |
| 14. Японія | 0 | 1 | 1 | 2 |
| 15. Аўстралія | 0 | 1 | 0 | 1 |
| — Польшча | 0 | 1 | 0 | 1 |
| — Эстонія | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 18. Аўстрыя | 0 | 0 | 1 | 1 |
| — Расія | 0 | 0 | 1 | 1 |
| — Харватыя | 0 | 0 | 1 | 1 |




16 лютага 2010 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь увяло ў абарачэнне паштовую марку «Іван Навуменка. 1925—2006. Народны пісьменнік Беларусі».

## КАНФІСКАВАЛІ АСАБІСТЫ АРСЕНАЛ

**На пасажырскім сядзенні легкавой машыны «Жыгулі» супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Ельскага РАУС пабачылі карабін калібру 7,62 мм часоў Вялікай Айчыннай вайны.**

Далей — больш. Пры асабістым аглядзе 28-гадовага пасажыра аўтамабіля ў яго кішэні было знойдзена 8 патронаў да гэтай зброі. У вёсцы Бабруйкі, дзе жыве яго бацька, знойдзена яшчэ 42 патроны, а таксама незарэгістраваная паляўнічая стрэльба ІЖ-18, 15 падрыхтаваных паляўнічых патронаў і прыцэл начнога бачання «Diarnsi», якія былі канфіскаваныя. Акрамя таго, па месцы жыхарства, у Ельску, грамадзянін добраахвотна выдаў міліцыі незарэгістраваную паляўнічую стрэльбу.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество
«Сберегательный банк «Беларусбанк»,
расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 23 ФЕВРАЛЯ 2010 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

***1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.***

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 20 февраля), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 23 февраля) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней – 20 февраля 2010 года.**

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 65, 218 84 73.**

УНП 100325912.

## ТРАНСПАРТНІКІ РАСПАЧЫНАЮЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЧЭМПІЯНАТУ

**Пад кіраўніцтвам міністра транспарту і камунікацый Івана Шчэрбы адбылася першая нарада па падрыхтоўцы да чэмпіянату свету па хакеі, які пройдзе ў Мінску ў 2014 годзе.**

Ужо сфарміраваная рабочая група Мінтранса, у якую ўвайшлі прадстаўнікі авіяцыйнага, чыгуначнага і аўтамабільнага транспарту, хутка да іх далучацца і прадстаўнікі воднага. На працягу найбліжэйшых гадоў транспартнікам трэба будзе вырашыць шэраг задач: рэканструяваць дарогі, электрыфікаваць многія ўчасткі Беларускай чыгункі, адкрыць новыя авіярэйсы, аб'екты сэрвісу і, зразумела, прыняць дадатковыя меры для забеспячэння бяспекі руху. У сувязі з правядзеннем чэмпіянату такога ўзроўню падобныя нарады будуць праводзіцца ў міністэрстве як мінімум раз на месяц.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**ККУП «Витебский областной центр маркетинга» проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества ликвидируемого предприятия ОАО «Оршанский пивоваренный завод»**

| № | Наименование объекта, краткая характеристика | Нач. цена без учета НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| 1 | здание склада площадью 1051 кв.м | 125 390 362 |
| 2 | здание арочного склада площадью 767 кв.м | 74 733 440 |
| 3 | здание мастерских площадью 133 кв.м | 27 088 983 |
| 4 | здание гаражей площадью 963 кв.м | 149 096 909 |
| 5 | здание котельной площадью 428,0 кв.м, здание бойлерной площадью 68,1 кв.м | 113 282 836 |
| 6 | здание склада площадью 75 кв.м | 12 994 560 |
| 7 | здание цеха безалкогольных напитков площадью 967 кв.м | 118 108 800 |
| 8 | здание цеха новой солодовни площадью 2270,0 кв.м | 375 918 234 |
| 9 | здание склада площадью 221,0 кв.м | 24 365 568 |
| 10 | гл. корпус, цех розлива пива площадью 3538,0 кв.м, здание слесарной мастерской площадью 29,7 кв.м | 659 358 720 |

Повторный аукцион состоится 26.02.2010 г. в 15.00 по адресу: 210015, г. Витебск, пр-т Черняховского, 9 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 210015, г. Витебск, пр-т Черняховского, 9 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи заявлений: **25.02.2010 г. до 17.30**. **Контактные тел: (0212) 47 97 35, (044) 722 69 02; e-mail: vcm74@mail.ru, www.vitinvest.biz.**

**ККУП «Витебский областной центр маркетинга» проводит открытый аукцион**

| № лота | Наименование объекта, его краткая характеристика | Местонахождение объекта | Начальная цена (бел. руб.) без учета НДС | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Трехэтажное административно-торговое здание «Пассаж» общей площадью 971,4 кв.м, 1946 года постройки | Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленина, д. 35 | 1 747 240 000 | 34 944 800 |

Аукцион состоится 22.03.2010 г. в 11.00 по адресу: г. Витебск, проспект Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов 19.03.2010 г. до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются юридические и физические лица.

**Контактные тел: (0212) 47 97 35, (044) 722 69 02; e-mail: vcm74@mail.ru, www.vitinvest.biz**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ

**Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, пр. Черняховского, 9**

**Повторный аукцион на право заключения договора аренды земельного участка**

| № лота | Кадастровый номер и адрес земельного участка, его площадь | Функциональное назначение земельного участка, срок аренды | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель | Начальная цена (бел. руб.) | Размер задатка и реквизиты для его внесения | Расходы по подготовке документации, руб. | Расходы, связанные с проведением аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок с кадастровым номером 221288109601000297, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Сокольники, ул. Железнодорожная, 3 площадью 0,3248 га | Земельный участок под размещение производственного объекта. Срок аренды 50 лет | Наличие централизованного электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения. Ограничения в использовании земель отсутствуют | 1 832 200 | 183 000 бел. руб. на р/с 3602314000014 в филиале № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 259, УНП 300196132, код платежа 04002. Получатель платежа: финансовый отдел Витебского районного исполнительного комитета | 768 266 | 3 421 290 |
| 2. | Земельный участок с кадастровым номером 221288109601000298, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Сокольники, ул. Железнодорожная, 4 площадью 1,0458 га | Земельный участок под размещение производственного объекта. Срок аренды 50 лет | Наличие централизованного электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения. Ограничения: земли находятся в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 В | 5 898 770 | 589 000 бел. руб. на р/с 3602314000014 в филиале № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 259, УНП 300196132, код платежа 04002. Получатель платежа: финансовый отдел Витебского районного исполнительного комитета | 715 638 | 3 421 290 |
| 3. | Земельный участок с кадастровым номером 221288109601000300, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Сокольники, ул. Железнодорожная, 6 площадью 1,1858 га | Земельный участок под размещение производственного объекта. Срок аренды 50 лет | Наличие централизованного электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения. Ограничения в использовании земель отсутствуют | 6 689 067 | 668 000 бел. руб. на р/с 3602314000014 в филиале № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 259, УНП 300196132, код платежа 04002. Получатель платежа: финансовый отдел Витебского районного исполнительного комитета | 730 949 | 3 421 290 |
| 4. | Земельный участок с кадастровым номером 221288109601000299, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Сокольники, ул. Железнодорожная, 8 площадью 0,7689 га | Земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения (размещение производственного объекта). Срок аренды 50 лет | Наличие централизованного электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения. Ограничения в использовании земель отсутствуют | 4 337 338 | 433 000 бел. руб. на р/с 3602314000014 в филиале № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 259, УНП 300196132, код платежа 04002. Получатель платежа: финансовый отдел Витебского районного исполнительного комитета | 727 281 | 3 421 290 |
| 5. | Земельный участок с кадастровым номером 221288109601000296, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Сокольники, ул. Железнодорожная, 10 площадью 0,6319 га | Земельный участок под размещение производственного объекта. Срок аренды 50 лет | Наличие централизованного электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения. Ограничения в использовании земель отсутствуют | 3 564 525 | 356 000 бел. руб. на р/с 3602314000014 в филиале № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 259, УНП 300196132, код платежа 04002. Получатель платежа: финансовый отдел Витебского районного исполнительного комитета | 678 598 | 3 421 290 |

**Дата, время и место проведения аукциона – 22.03.2010 г. в 15.00, г. Витебск, пр. Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок приема документов – 16.03.2010 г. до 17.30.**

| № лота | Кадастровый номер и адрес земельного участка, его площадь | Функциональное назначение земельного участка, срок аренды | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель | Начальная цена (бел. руб.) | Размер задатка и реквизиты для его внесения | Расходы по подготовке документации, руб. | Расходы, связанные с проведением аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок с кадастровым номером 221850100001003269, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, г. Городок, ул. Володарского площадью 0,0431 га | Земельный участок для размещения объектов розничной торговли (мини-магазин). Срок аренды 99 лет | Наличие централизованного водоснабжения, водоотведения, теплоснабжения.Ограничения: земли находятся в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 В, в охранной зоне тепловых сетей | 2 544 624 | 254 462 бел. руб. на р/с 3602316001430 в ф-ле № 207 ОАО «АСБ Беларусбанк», 211573, Витебская обл., г. Городок, ул. Володарского, 15, МФО 150801641, УНП 300066448, код платежа 04002, получатель платежа: Городокский районный исполнительный комитет | 823 019 | 3 421 290 |

**Дата, время и место проведения аукциона – 24.03.2010 г. в 15.00, г. Городок, ул. Пролетарская, 2, Городокский районный исполнительный комитет. Окончательный срок приема документов – 18.03.2010 г. до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр. Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».**

**Аукцион на право заключения договора аренды земельного участка**

| № лота | Кадастровый номер и адрес земельного участка, его площадь | Функциональное назначение земельного участка, срок аренды | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель | Начальная цена (бел. руб.) | Размер задатка и реквизиты для его внесения | Расходы по подготовке документации, руб. | Расходы, связанные с проведением аукциона, руб. | Условия аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок с кадастровым номером 223600000001003483, расположенного по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н площадью 0,9578 га | Для строительства и обслуживания автомобильной газовой заправочной станции на км 550 (право) автодороги М1/Е30 Брест (Козловичи) – Минск – граница Российской Федерации (Редьки). Срок аренды 25 лет | Коммуникации отсутствуют. Наличие асфальтированного подъезда, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения | 188 479 | 18 800 бел. руб., р/с 3602322000067 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 300168540, код платежа 04002. Получатель платежа: финансовый отдел Оршанского районного исполнительного комитета | 845 016 | 3 421 290 | Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 51 042 760 бел. руб. Оплата убытков и упущенной выгоды сельскохозяйственному производственному кооперативу «Задровье» в размере 3 058 900 бел. руб. |

**Дата, время и место проведения аукциона: 26.03.2010 г. в 15.00 по адресу: г. Орша, ул. Островского, 2 в здании Оршанского районного исполнительного комитета. Окончательный срок приема документов: 22.03.2010 г. до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр. Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».**

**Аукцион по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома**

| № лота | Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка | Целевое назначение | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) | Размер задатка и реквизиты для его внесения | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. | Расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок с кадастровым номером 221882207301000071, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Вайханский с/с, д. Мариамполь, № 1 площадью 0,2495 га | Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | Коммуникации отсутствуют. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения: земельный участок находится в водоохранной зоне вне прибрежной полосы озера Лосвидо | 1 560 000 | 156 000 бел. руб. на р/с 3600316023797 в филиале № 207 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Городок, ул. Володарского, д.15, МФО 641, УНН 300066953, код платежа 04901, получатель платежа: Вайханский сельский исполнительный комитет | 504 276 | 2 245 165 |
| 2. | Земельный участок с кадастровым номером 221882207301000070, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Вайханский с/с, д. Мариамполь, № 2 площадью 0,2493 га | Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | Коммуникации отсутствуют. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения: земельный участок находится в водоохранной зоне вне прибрежной полосы озера Лосвидо | 1 559 000 | 155 900 бел. руб. на р/с 3600316023797 в филиале № 207 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Городок, ул. Володарского, д.15, МФО 641, УНН 300066953, код платежа 04901, получатель платежа: Вайханский сельский исполнительный комитет | 504 276 | 2 245 165 |
| 3. | Земельный участок с кадастровым номером 221887008601000087, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Пальминский с/с, д. Хоботы, ул. Озерная, д. 28 площадью 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | Коммуникации отсутствуют. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения: земельный участок находится в водоохранной зоне вне прибрежной полосы озера Вымно | 1 407 000 | 140 700 бел. руб. на р/с 3600316083795 в филиале № 207 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Городок, ул. Володарского, д. 15, МФО 641, УНН 300066527, код платежа 04901, получатель платежа: Пальминский сельский исполнительный комитет | 573 548 | 2 245 165 |
| 4. | Земельный участок с кадастровым номером 221887008601000086, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Пальминский с/с, д. Хоботы, ул. Центральная, д. 40А площадью 0,2465 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | Коммуникации отсутствуют. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения: земельный участок находится в водоохранной зоне вне прибрежной полосы озера Вымно, охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В | 2 312 000 | 231 200 бел. руб. на р/с 3600316083795 в филиале № 207 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Городок, ул. Володарского, д. 15, МФО 641, УНН 300066527, код платежа 04901, получатель платежа: Пальминский сельский исполнительный комитет | 571 903 | 2 245 165 |

**Дата, время и место проведения аукциона – 24.03.2010 г. в 16.00, г. Городок, ул. Пролетарская, 2, Городокский районный исполнительный комитет. Окончательный срок приема документов – 18.03.2010 г. до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр. Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».**

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр. Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».**

Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории отсутствуют.

Аукционы проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

**Победитель аукциона обязан:** подписать протокол аукциона в день проведения аукциона, в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка оплатить предмет аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона.

В случае приобретения зем. участка в частную собственность – осуществить в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права собственности на земельный участок; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; занять (освоить) земельный участок не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права собственности на него. В случае приобретения права аренды не позднее 2-х рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнений условий, указанных в протоколе аукциона, заключить с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка; осуществить государственную регистрацию в двухмесячный срок со дня заключения договора аренды; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

1. **Для участия в аукционе приглашаются:** при продаже земельного участка в частную собственность – граждане и юридические лица Республики Беларусь, при продаже права на заключение договора аренды земельного участка – граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица. Гражданин, индивидуальный предприниматель, юридическое лицо должны подать заявление об участии в аукционе и подписать соглашение с организатором аукциона. К заявлению прилагается:

- для граждан – копия документа, содержащего идентификационные сведения гражданина;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- для представителей гражданина и индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- для представителей или уполномоченных должностных лиц юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем.

2. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра местности земельного участка.

3. В случае отказа или уклонения Победителя аукциона в установленный срок от внесения платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, внесенный им задаток и затраты на организацию и проведение аукциона возврату не подлежат.

4. **Контактный тел.: (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, www.vitinvest.biz, www.gki.gov.by.**

